
ДЗЕЦІ НА ДАРОЗЕ 4

ІКОНА З «САКРЭТАМ» 14


Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

26 ЖНІЎНЯ 2020 г. СЕРАДА № 165 (29279)

## ЦЫТАТА ДНЯ



**Аляксандр КАДЛУБАЙ, адказны сакратар Нацыянальнай камісіі па правах дзіцяці, намеснік міністра адукацыі:**

*«Менш за тыдзень застаецца да пачатку новага навучальнага года — свята, якое ў нашай краіне традыцыйна адзначаецца шырока і ўрачыста. Аднак сацыяльна-палітычная сітуацыя ўцягвання дзяцей у палітычныя гульні дарослых, якая склалася ў цяперашні час, у большасці беларускіх грамадзян і педагагічных работнікаў выклікае асцярогу. Гэта недапушчальна. 1 верасня дзеці павінны сесці за парты, атрымліваць веды, займацца ў гуртках па інтарэсах, спартыўных секцыях».*



# НЕЗВЫЧАЙНЫ ПАСАЖЫР І НАТХНЯЛЬНІК

Жыхар Лепеля Іван БУДЗІЧ перавозіць экспанат сваёй персанальнай выстаўкі — драўляную фігуру мядзведзя (выстаўка праходзіла ў Лепельскім краязнаўчым музеі). Вясёлы і дабрадушны мядзведзь, «апрануты» ў беларускую кашулю, быў «гаспадаром» невялікай, але ўтульнай выставачнай залы, дзе выстаўляліся графічныя лісты і акварэль, разьбяныя пано. Касалапы ствараў пазітыўны настрой і ў час адкрыцця, і на працягу работы экспазіцыі. А яшчэ «ўвасабляў» мастака, які ведае таямніцы прыроды. — Прырода дорыць мне асалоду і натхненне жыць, ствараць, адкрывае бясконцыя фантазіі, а лясы і азёры, птушкі і звяры робяцца персанажамі маіх твораў. Бярэзінскі запаведнік, дзе я часта бываю, заўсёды нечым здзіўляе, — кажа Іван Мікалаевіч, і на яго твары з'яўляецца ўсмешка: вось і гэты мішка — прататып запаведнага мядзведзя, і менавіта Бярэзінскага.

СТАР. 13

## КОРАТКА

- **У Беларусі засталося сабраць збожжавыя менш чым з 8 % плошчаў.**
- Патрыяршым экзархам усяе Беларусі, мітрапалітам Мінскім і Заслаўскім прызначаны епіскап Барысаўскі і Мар'інагорскі Веніямін з захаваннем за ім часовага кіравання Барысаўскай епархіяй.
- **Сярэдні заробак у Беларусі ў ліпені склаў Br1287,5.**
- «Гомсельмаш» пачаў пастаўкі камбайнаў GS12A1 у Арменію.
- **Міністэрства аховы здароўя вынесла на грамадскае абмеркаванне праект пастановы аб безрэцэптурных леках.**
- Арсенал часоў вайны знайшлі ў Пінскім раёне.
- **У Беларусі жыве амаль чвэрць сусветнай папуляцыі зуброў.**
- У Бабруйскім раёне правядуць «Конны фэст».

ISSN 1990 - 763X

20165>

ГЛУША Адамовіча

*«Звязда» працягвае друкаваць матэрыялы ў падтрымку адкрыцця ў пасёлку Глуша Бабруйскага раёна музея, прысвечанага творчасці Алеся Адамовіча.*

# «Для нас вялікі гонар, што Адамовіч нарадзіўся ў Канюхах»



**Энтузіясты з Канюхоў зрабілі яго акурат напярэдадні Дня беларускага пісьменства. Знамянальна, што наступнай сталіцай гэтага свята стане менавіта Капыль — цэнтр раёна, у якім нарадзіўся пісьменнік.**

СТАР. 5

Будзьце здаровыя!

# Вакцынацыя супраць грыпу пачнецца ў верасні

**У Беларусі, як і ў іншых краінах Еўропы, распачата падрыхтоўка да вакцынацыі супраць грыпу, якая сёлета пройдзе ў асаблівых умовах. Міністэрства аховы здароўя папярэдзіла, што ў 2020 годзе чакаецца сумесная цыркуляцыя розных вірусаў і рызыка заражэння адразу некалькімі вельмі высокая.**

## АСАБЛІВАЯ НЕБЯСПЕКА — У СПАЛУЧЭННІ COVID-19 І ГРЫПУ

— Сёлета свет сутыкнуўся з новым каранавірусам (SARS-CoV-2), распаўсюджванне якога прыняло пандэмічны характар і прывяло да захворвання больш чым 17,5 мільёна чалавек і больш чым 670 тысяч смерцяў (па звестках на 1 жніўня). Барацьба з гэтым вірусам абцяжарана адсутнасцю лекаў і вакцыны, якія маглі б спецыфічна ўздзейнічаць на яго, абараняючы людзей ад заражэння і выратоўваючы ад захворвання і цяжкіх зыходаў, — звярнулі ўвагу ў аддзеле гігіены, эпідэміялогіі і прафілактыкі Міністэрства аховы здароўя.

З улікам таго факта, што новы каранавірус працягвае цыркуляваць сярод насельніцтва, у перыяд сезоннага ўздыму захваральнасці на вострыя рэспіраторныя інфекцыі чакаецца сумесная цыркуляцыя розных вірусаў, і ёсць высокая рызыка заражэння адначасова некалькімі з іх. Гэта можа быць або адначасовае інфіцыраванне, або сітуацыя, калі да вірусная захворвання, якое ўжо ёсць, далучаецца новае.

СТАР. 6

З першых вуснаў

# «Вось пенсіі — гэта святое»

**Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка прыняў з дакладам першага намесніка прэм'ер-міністра Мікалая Снапкова і міністра фінансаў Юрыя Селіверстава, паведаміла прэс-служба кіраўніка краіны. Размова ішла пра выкананне дзяржаўнага і мясцовых бюджэтаў.**



Першапачаткова Прэзідэнт звярнуў увагу на тое, як уплывае бюджэт на фарміраванне заработнай платы: «Мы дамаўляліся, што ў бюджэтнікаў яна павінна быць 80 працэнтаў ад сярэдняй зарплаты па краіне. ***Зразумела, бюджэт істотна ўплывае і на пенсіі нашых людзей. Вось пенсіі — гэта святое».***

Кіраўнік дзяржавы падкрэсліў, што ўзровень пенсій павінен складаць 40 працэнтаў ад сярэдняй зарплаты. «Ветэраны аказаліся нашымі самымі стойкімі і надзейнымі людзьмі, фактычна апорай нашай дзяржаўнасці ў гэты няпросты перыяд. Ні ў якім разе іх нельга пакрыўдзіць. Калі мы іх пакрыўдзім — значыць, мы проста не ўлада і не дзяржава», — заявіў Аляксандр Лукашэнка.

Яшчэ адна тэма сустрэчы — абавязацельствы дзяржавы па выплаце знешняга доўгу. «Калі яго трэба дзесьці рэфінансаваць, значыць, нам трэба падумаць, па якіх кірунках разгортваць гэтую работу. Калі мы не будзем рэфінансаваць, самі справімся, значыць, вы мне павінны далажыць, якім чынам», — заўважыў Прэзідэнт.

Па яго словах, сёлета час няпросты — вялікія грошы пайшлі на лячэнне людзей ад каранавіруса, да таго ж напружваюць эканамічную абстаноўку акцыі, мітынгі. Аляксандр Лукашэнка канстатаваў, што страт ад іх ужо на 500 мільёнаў, а будзе больш на кошт ускосных страт.

Прэс-служба дадае, што Аляксандр Лукашэнка пацікавіўся паступленнямі даходаў у бюджэт і якім прагназуецца яго дэфіцыт у сувязі з эканамічным спадам не толькі ў Беларусі, але і ў партнёраў, на гандлёвых адносінах з якімі адбілася закрыццё рынкаў. «Што адбываецца на знешніх рынках, як функцыянуе эканоміка і па якіх артыкулах бюджэту мы нешта недаатрымліваем?» — запытаў Прэзідэнт.

**У ТЭМУ**

Пасля нарады з журналістамі пагутарыў міністр фінансаў Юрый Селіверстаў, перадае карэспандэнт БелТА.

Па словах міністра, пэўны недабор даходаў у рэспубліканскім бюджэце стварае некаторыя цяжкасці ў фінансаванні расходаў. «Гэта дастаткова вялікія цяжкасці з пункту гледжання папярэдніх гадоў. Але з улікам таго, што ў нас ёсць пэўны аб'ём астаткаў, якія мы сфарміравалі ў папярэднія гады, усе сацыяльныя абавязацельствы мы выплацім», — сказаў Юрый Селіверстаў.

Растлумачыў кіраўнік Мінфіна праблемы з выкананнем рэспубліканскага бюджэту — яны звязаныя з падзеннем паступленняў ад буйных прадпрыемстваў, на дзейнасці якіх адбілася закрыццё рынкаў на фоне пандэміі. У пачатку года былі пэўныя пытанні і з паступленнем нафтапрадуктаў. «Недабор даходаў у цэлым па рэспубліканскім бюджэце чакаецца каля трох–чатырох мільярдаў рублёў. Што датычыцца мясцовых бюджэтаў, яны выконваюцца стабільна», — звярнуў ён увагу.

Плацяжы па валютным дзярждоўгу сёлета складаюць каля $3,6 млрд, прычым $2 млрд дзяржава ўжо выплаціла.

Кажучы пра ваганні на валютным рынку і іх уплыў на дзяржбюджэт, Юрый Селіверстаў звярнуў увагу на тое, што выплаты, прывязаныя да долара, будуць крыху павялічвацца. «Што ж датычыцца даходаў ад такіх, напрыклад, экспарцёраў, як «Беларуськалій», то яны, наадварот, будуць прырастаць», — растлумачыў міністр.

Ён дадаў, што Беларусь ужо зрабіла асноўную частку ўзносаў у статутныя фонды міжнародных арганізацый, і на гэтыя выдаткі ваганні на валютным рынку сур'ёзна не паўплываюць.

Ва ўрадзе

# Цяпер важна не ўпусціць момант

## На прэзідыуме Савета Міністраў разгледзелі пытанні стымулявання экспарту

**«Найважнейшыя мэтавыя задачы ўрада па забеспячэнні эканамічнага росту — нарошчванне экспарту тавараў і паслуг з паралельным вырашэннем задачы эфектыўнага імпартазамяшчэння, — адкрыў пасяджэнне прэм'ер-міністр Раман ГАЛОЎЧАНКА. — На мінулым тыдні прэзідыум разглядаў пытанні імпартазамяшчэння. Сёння комплексна разгледзім пытанні экспарту, яго інстытуцыянальнай структуры, сістэмныя пытанні стымулявання і падтрымкі прасоўвання тавараў і паслуг на знешнія рынкі. Дадзім аб'ектыўную ацэнку вынікам работы тых, хто за гэта адказвае».**

Перш за ўсё прэм'ер адзначыў, што па выніках першага паўгоддзя ў Беларусі склалася станоўчае сальда гандлю таварамі і паслугамі ў памеры 757 мільёнаў долараў ЗША, што на 488 мільёнаў долараў больш, чым летась.

«Гэта добра для плацежнага балансу і для макраэканамічнай збалансаванасці, — заўважыў Раман Галоўчанка. — Але па-ранейшаму станоўчае сальда выцягваюць паслугі».

Кіраўнік Савета Міністраў дадаў, што тэмпы росту экспарту запаволіліся, прычым як па таварах, так і па паслугах, але па апошніх адмоўная дынаміка меншая.

«Вядома, такі вынік часткова можна тлумачыць пандэміяй, замарожваннем рынкаў, цэлым комплексам знешніх фактараў, якія, несумненна, аказалі ўплыў на стан знешнегандлёвай дзейнасці, — сказаў ён. — Змянілася цэнавая і тварная кан'юнктура на знешніх рынках, былі вядомыя праблемы ў нафтаперапрацоўцы, іншых галінах, тым не менш шэраг галін практычна не адчуў уплыву эпідэміялагічных абмежаванняў і нават палепшыў свае вынікі знешняга гандлю».

Павялічыўся экспарт сельскагаспадарчай прадукцыі, прадуктаў харчавання (рост 6,4 %), адукацыйных паслуг (3,1 %), камп'ютарных і інфармацыйных паслуг (21,6 %).

У параметрах прагнозу па экспарце тавараў спрацавалі прадпрыемствы камунальнай і пазаведамаснай падпарадкаванасці па Брэсцкай, Гомельскай, Гродзенскай і Мінскай абласцях.

Па экспарце паслуг з добрым вынікам (зноў за кошт IT-галіны, пракаментаваў Галоўчанка) выйшаў толькі Мінск — 110,2 %. Астатнія рэгіёны недацягнулі.

«Як бачым, карціна неаднародная, вынікі розныя і па органах дзяржкіравання, і па замежных установах, якія з'яўляюцца нашымі асноўнымі апорнымі пунктамі па прасоўванні тавараў і паслуг на знешнія рынкі», — рэзюмаваў статыстычныя звесткі прэм'ер-міністр.

Ён са шкадаваннем адзначыў аддаленне ад вырашэння стратэгічнай задачы зніжэння залежнасці ад аднаго-двух рынкаў, маючы на ўвазе выхад на экспартную формулу «30-30-30» (да такіх паказчыкаў імкнецца беларускі ўрад — траціна знешняга продажу павінна прыпадаць на краіны постсавецкай прасторы, траціна — на Еўрапейскі саюз, траціна — на краіны далёкага замежжа). За першае паўгоддзе беларускі экспарт у краіны ЕАЭС склаў 50,2 %, у краіны Еўрапейскага саюза — 17,1 %, у іншыя краіны — 32,7 %.

«Асноўная прычына прасядання па рынку Еўрасаюза — рэзкае падзенне экспарту нафтапрадуктаў у Еўропу, і гэтая сітуацыя відавочна агаліла праблему таварнай наменклатуры экспартных паставак, перш за ўсё на еўрапейскі рынак», — звярнуў увагу Раман Галоўчанка.

Для больш аб'ектыўнай ацэнкі работы ўрада па дыверсіфікацыі экспарту прэм'ер-міністр заклікаў дакладна вызначыцца з крытэрыямі, па якіх краіны могуць быць аднесеныя да экспартных для Беларусі, — які мінімальны аб'ём экспарту можа ўлічвацца, каб лічыць, што гэты рынак намі засвоены.

«Нягледзячы на наяўнасць аб'ектыўных праблем, пры належнай арганізацыі, зладжанай рабоце вынікі экспарту маглі б быць значна лепшыя, — падкрэсліў кіраўнік урада. — Рынак цяпер значна ажывае, у нас ёсць перавага — мы не спынялі вытворчасць, калі канкурэнты спыніліся, мы панеслі менш страт, зрабілі накапленні, таму нам ёсць што прапанаваць рынку. Важна зараз, як Прэзідэнт неаднойчы звяртаў увагу, не ўпусціць момант. Інструменты падтрымкі і стымулявання экспарту, у тым ліку на новых рынках, у нас ёсць. Грошы ў бюджэце на гэтыя мэты таксама ёсць. Таму трэба рухацца наперад».

**Вольга МЯДЗВЕДЗЕВА.**

# ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

## Прэм'ер Туніса абвясціў фарміраванне новага ўрада тэхнакратаў



«Пасля серыі кансультацый з партыямі і парламенцкімі блокамі і пасля ацэнкі эканамічнай, палітычнай і сацыяльнай абстаноўкі я прыйшоў да высновы пра неабходнасць (фарміравання. — «Зв.») урада, які складаецца з незалежных прафесіяналаў», — прыводзіць тэлеканал Sky News Arabia заяву Хішама Машышы. Кіраўнік кабінета міністраў таксама падкрэсліў, што ва ўрад увойдуць спецыялісты, якія не знаходзяцца ў якіх-небудзь партыях, што, на думку прэм'ера, дазволіць дыстанцыравацца ад палітычных рознагалоссяў і засяродзіцца на прыняцці мер па аднаўленні эканомікі краіны. У складзе новага ўрада 28 чалавек, восем з якіх — жанчыны. Прэзідэнт Туніса Каіс Саід прызначыў Машышы прэм'ер-міністрам у канцы ліпеня і даручыў яму сфарміраваць новы ўрад. Паводле канстытуцыі краіны, для гэтага адводзіўся адзін месяц. Канчатковы склад урада павінен быць зацверджаны Асамблеяй народных прадстаўнікоў (аднапалатным парламентам). У выпадку, калі гэтага не адбудзецца, прэзідэнту краіны дадзена права распусціць заканадаўчы орган і аб'явіць датэрміновыя выбары.

## Goldman Sachs прадказаў звальненне амаль чвэрці часова адхіленых ад работы ў ЗША

На раннім этапе пандэміі работадаўцы ў ЗША перасталі плаціць больш чым 22 мільёнам чалавек, адзначае Bloomberg. У красавіку часова беспрацоўных у ЗША было 18 мільёнаў. Гэта самы высокі паказчык за ўвесь час назіранняў. Калі эканамічная дзейнасць пачала ажываць, вяртанне многіх з гэтых людзей дапамагло забяспечыць аднаўленне амерыканскага рынку працы ў маі, чэрвені і ліпені. У той жа час перспектывы паўторнага найму для часова не працуючых у мінулым месяцы пачалі пагаршацца, адзначыў эканаміст Goldman Sachs Джозеф Брыгс. Хоць доля тых, для каго часовае адхіленне ператвараецца ў звальненне, застаецца нізкай, яна ў той жа час амаль падвоілася з чэрвеня да ліпеня, і Goldman чакае далейшага яе павелічэння па меры паслаблення мер падтрымкі з боку ўлад ЗША.

## У Ганконгу выявілі першы выпадак паўторнага заражэння каранавірусам

Дыягназ быў другі раз пастаўлены мужчыну, які ўжо перахварэў на COVID-19 чатыры з паловай месяцы таму. На момант паўторнага тэсціравання, якое выявіла інфекцыю, у пацыента не было ніякіх прыкмет захворвання. Даследаванне віруса паказала, што яго РНК значна адрозніваецца ад генетычнага кода таго штама SARS-Cov-2, што выклікаў першы выпадак заражэння. Навукоўцам вядома, што людзі, якія перахварэлі на COVID-19, набываюць імунітэт да віруса, аднак дагэтуль нельга з упэўненасцю сцвярджаць, наколькі эфектыўная гэтая абарона і як доўга яна доўжыцца.

Выпадак з пацыентам у Ганконгу дэманструе, што імунітэт да віруса, ад якога памерла ўжо больш за 800 тысяч чалавек па ўсім свеце, можа быць вельмі непрацяглы. 33-гадовы жыхар Ганконга, які перахварэў на COVID-19, быў выпісаны са шпіталя ў красавіку — урачы прызналі яго цалкам здаровым. Аднак у жніўні, вярнуўшыся з паездкі ў Іспанію, ён здаў абавязковы тэст у аэрапорце, і той зноў пацвердзіў наяўнасць віруса. Раней кітайскія ўлады ўжо паведамлялі пра некалькі выпадкаў паўторнага выяўлення COVID-19.



Па іх інфармацыі, гаворка ідзе пра 5–15 % тых, хто перахварэў, аднак нельга з упэўненасцю сцвярджаць, былі гэтыя людзі сапраўды заражаныя паўторна або іх не далячылі першы раз.

Меркаванне

# УСЯ СПРАВА Ў ГРАШАХ

## Любая каляровая рэвалюцыя — гэта добры бізнес-план з вельмі высокай даходнасцю

**Аб прычынах, прагнозах і выніках сённяшняй сітуацыі «Звяздзе» расказаў аналітык Беларускага інстытута стратэгічных даследаванняў Аляксей АЎДОНІН.**

***— Калі пачынаць з пачатку, адкуль пайшла спроба беларускай каляровай рэвалюцыі? Наўрад ці гэта акцыя, прымеркаваная да 9 жніўня.***

— Асновы бягучай нестабільнасці пачалі фарміравацца яшчэ ў 2016 годзе — калі супраць Беларусі былі створаны спецыяльныя інфармацыйныя пляцоўкі (тэлеграм-каналы, сацмедыя, паблікі), мэтай якіх было «пачуццё незадаволенасці». Гэты класічны тэрмін ужываецца ў тэхналогіях пратэстаў.

Самі тэхналогіі не ўзнікаюць ніадкуль — іх фарміруюць «людзі слова». Зараз гэта блогеры, адміністратары тэлеграм-каналаў, раней — пісьменнікі, журналісты, якія працавалі ў інтарэсах тых ці іншых структур і за грошы параджалі крытычную ацэнку дзеянняў урада, кіраўніцтва, у выніку — недаверу ў грамадстве да ўлады. Гэта мы дакладна бачым на ўсіх тэлеграм-каналах, калі яны пачалі дзейнічаць як «крытычныя» пляцоўкі, потым перараслі ў пляцоўкі для агітацыі, а далей — непасрэдна для каардынацыі дзеянняў з адпаведнымі заклікамі.

Гэта методыка адпрацоўвалася на іншых краінах, мае вельмі



жорсткі па часе, ключавых актарах (тых, хто ўдзельнічае) алгарытм. Зразумела, што ўся мадэль не можа рэалізоўвацца без добрага фінансавання, і тым, хто заказваў інфармацыйную кампанію і пратэсныя з'явы, каштуе вялікіх грошай.

Заказчыкі каляровых рэвалюцый заўсёды пераследуюць выключна свае эканамічныя мэты. Сутнасць іх адна: умоўна, мільярд-паўтара ўкладаецца ў рэвалюцыю, а пасля ўстаноўкі ў краіне нейкага «часовага ўрада» за кошт маніпулявання і кіравання ім усе актывы, створаныя намаганнямі народа (заводы, фабрыкі, прадпрыемствы, прыродныя выкапні), прадаюцца за бясцэнак буйным карпарацыям. Трэба заўсёды глядзець, што любая каляровая рэвалюцыя — гэта добры бізнес-план з вельмі высокай даходнасцю і прыбыткам. Укладаючы адзін рубель, вы атрымліваеце нават не два, а нашмат больш трохсот працэнтаў, вызначаных Карлам Марксам як крытычная велічыня для любога прадпрымальніка для прынцыпу незаконных ці антымаральных, антыгуманных дзеянняў. Што, у прынцыпе, мы бачым зараз у нас у Беларусі і ў іншых краінах, якія перажылі каляровыя рэвалюцыі.

Адназначна каляровая рэвалюцыя — гэта дэстабілізацыя сітуацыі, каб улада аслабела, народ страціў магчымасць уплываць на любыя палітычныя і эканамічныя працэсы, і ў далейшым продаж асноўных актываў, уласнасці за бясцэнак. Самае галоўнае, што церпіць у гэтым усім менавіта просты рабочы ці працаўнік вёскі, бо якраз на яго ўскладаецца ўся наступная нагрузка. Іншымі словамі, гэта чыстае ўзмацненне эксплуатацыі працоўных аж да таго, што ўсе дасягнутыя ў XX стагоддзі сацыяльныя заваяванні (умоўна, 8-гадзінны працоўны дзень) могуць быць нівеліраваны. Як мы бачым, у краінах, дзе прайшла каляровая рэвалюцыя, людзі альбо знаходзяцца ў беднасці і жабрацтве, альбо вымушаны працаваць нашмат больш, чым восем гадзін у суткі, каб пракарміць сваю сям'і.

***— І якія ж прагнозы? Як будуць дзейнічаць далей карыстальнікі «метадычкі» Шарпа?***

— Заказчыкі, якія ініцыявалі ўсе гэтыя працэсы ў нас у Беларусі, умеюць лічыць грошы. Вядома, яны хочуць нейкага выніку. У першую чаргу яны зараз патрабуюць пэўных палітычных паслабленняў, крокаў ад улады ў выглядзе нейкіх перагавораў, кансультацый з нейкімі «камітэтамі», «камісіямі» з удзелам трэцяга боку, пасрэднікаў — іншых дзяржаў.

Але ініцыятыва з боку менавіта прыхільнікаў гэтага варыянту развіцця падзей ужо ўпушчана і насамрэч дзякуючы вельмі шчыльнаму ўзаемадзеянню Беларусі з Расіяй у пытаннях бяспекі і дыпламатыі ўдалося збіць актыўнасць, напал. З'явілася магчымасць сфарміраваць і паказаць усім астатнім, перш за ўсё, што дзеючая ўлада мае вялікую падтрымку народа, што структура ўлады — маналітная, не рассыпалася. Гэта дае магчымасць кіраваць прадпрыемствамі і не дапускаць стачак, якія так актыўна хацелі развіць апаненты ўлады і якія маглі прывесці да калапсу эканомікі.

Зараз для ініцыятараў негатыўных працэсаў унутры Беларусі галоўнае — усімі праўдамі адмежавацца ад сваіх «рэалізатараў», якія пачалі ўдзельнічаць у гэтай авантуры, каб не атрымаць абвінавачванняў ва ўмяшальніцтве ў нацыянальныя працэсы.

***— На мінулым тыдні Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка папярэдзіў, што гэта «яшчэ нават не пік». На вашу думку, калі ж будзе пік? Да чаго яшчэ рыхтавацца?***

— Насамрэч «пік» мае больш шырокі характар. Гэта не толькі акцыі, якія праходзілі ў Мінску і іншых гарадах. У першую чаргу пік звязаны з фінансава-эканамічным становішчам. Зразумела, што тыя, хто прайграў, не дасягнуў выніку на ўкладзеныя сродкі, будуць імкнуцца ўсяляк пагоршыць наша эканамічнае становішча, каб у выніку ўнутры краіны пратэст пачаў фарміравацца не ў палітычным плане, а менавіта ў эканамічным зрэзе праз пагаршэнне дабрабыту насельніцтва.

**«Адназначна каляровая рэвалюцыя — гэта дэстабілізацыя сітуацыі, каб улада аслабела, народ страціў магчымасць уплываць на любыя палітычныя і эканамічныя працэсы, і ў далейшым продаж асноўных актываў, уласнасці за бясцэнак».**

Трэба разумець, што зараз, акрамя ўплыву пандэміі, мы будзем адчуваць і моцнае эканамічнае ўздзеянне. Каб праламіць гэту сцэну, якую імкнуцца ўзвесці супраць нас у шкоду нацыі і кожнаму беларусу, найбольш важнымі становяцца ўзмоцненая работа і дыржартарская апарата з работнікамі і партнёрамі на знешніх рынках, узаемадзеянне з фінансавымі цэнтрамі, тлумачэнні дыпламатычнага ведамства.

**Варвара МАРОЗАВА.**

А не шкодзь!

## БРАКАНЬЕРАЎ-ПАЛЯЎНІЧЫХ ВЫЯВІЛІ ФОТАПАСТКІ

Сезон здабычы птушак і капытных адкрыўся ў жніўні. І хоць для браканьераў сезон адкрыты заўсёды, у дні масавага палявання яны праяўляюць найбольшую актыўнасць, разлічваючы, што іх стрэлы не прыцягнуць асаблівай увагі. Тым не менш ёсць шмат розных спосабаў выявіць нелегальных паляўнічых. Пра адзін з такіх расказалі ў Дзяржаўнай інспекцыі аховы жывёльнага і расліннага свету.

На Брэстчыне, напрыклад, дзве групы браканьераў трапілі ў аб'ектывы фотапастак. Прылады ўстанавілі супрацоўнікі лясгасаў, а пасля перадалі інфармацыю аб парушальніках дзяржінспектарам.

У Ганцавіцкім раёне фотакамера захавала момант, калі з лесу выязджаюць двое мужчын на матацыкле, на багажніку — туша самца казулі. Па гэтых кадрах парушальнікаў пасля апазналі, да іх дадому прыйшлі з вобыскам. У аднаго з падазраваных выявілі трафейныя рогі і нелегальную стрэльбу. Мужчына пад грузам доказаў прызнаў факт незаконнай здабычы казулі. Ёсць у яго і зарэгістраваная зброя, з якой паляўнічаму неўзабаве давядзецца расстацца, як і з дзяржпасведчаннем на права палявання. Стралку пагражае крымінальная адказнасць, а яго таварыша могуць прыцягнуць за дапамогу ў транспарціроўцы тушы.

Яшчэ два нелегальных паляўнічых, якія перасоўваліся па ўгоддзях на аўто, трапілі на камеру ў Івацэвіцкім раёне. Іх машына добра знаёмая мясцовым прыродаахоўнікам: кіроўца і пасажыр — жыхары Івацэвіч, у мінулым паляўнічыя — прыцягваліся раней да адказнасці за незаконныя дзеянні са зброяй і боепрыпасамі і былі пазбаўлены правоў на паляванне. Як аказалася, гэтым разам пад дыванком у салоне аўтамабіля ў іх таксама ляжала незарэгістраваная стрэльба, а паміж сядзеннямі — патранташ з кулявымі патронамі.

Здабыць дзічыну мужчыны не паспелі, але з'яўленне са зброяй у паляўнічых угоддзях без дазвольных дакументаў расцэньваецца як незаконнае паляванне. У дачыненні да абодвух інспектары пачалі адміністрацыйныя працэсы. Прыцягнуць іх і па лініі міліцыі — зноў за незаконныя дзеянні са зброяй і боепрыпасамі.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

**Фота з сайта Дзяржінспекцыі.**



ФАКТЫ ПАДЗЕІ НАВІНЫ

## АДКРЫЛАСЯ ПАЛЯВАННЕ НА КАПЫТНЫХ

**У перыяд з 20 жніўня да 30 верасня дазволена здабываць дарослых самцоў лася, аленя высакароднага, аленя плямістага і лані, а таксама селекцыйных жывёл гэтых відаў любога полу і ўзросту.**



Як нагадалі ў Дзяржінспекцыі аховы жывёльнага і расліннага свету, паляванне можа праводзіцца на працягу сутак ружэйным спосабам з засады і з падыходу. Дазваляецца выкарыстоўваць наразную (з дульнай энергіяй кулі звыш 3000 джоўляў), гладкаствольную (з выкарыстаннем патронаў з куляй) і кідальную (лукі і арбалеты) паляўнічую зброю.

У выпадку незаконнай здабычы капытных парушальнікам пагражае крымінальная адказнасць з пакрыццём прычыненай шкоды, напрыклад, за лася ці аленя гэта сума складзе 300 базавых велічынь, або 8100 рублёў.

## ІНСПЕКТАРА ДАІ ЎДАРЫЛІ ДЫСКАМ АД КУЛЬТЫВАТАРА

**Распачата крымінальная справа, паведамляе ўпраўленне інфармацыі і грамадскіх сувязяў МУС.**

Пад Рагачовам адміністрацыйны працэс па факце перадачы кіравання аўтамабілем бяспраўніку скончыўся крымінальнай справай. Падазраванай прызнана 54-гадовая жыхарка пасёлка Дзятлаўшчына, якая замінала інспектарам затрымліваць свайго зяця і ўдарыла аднаго з праваахоўнікаў па галаве металічным дыскам ад культыватара.

Гісторыя пачалася са званка на «102»: мужчына паведаміў, што па пасёлку на Audi ездзіць п'яны чалавек. Нарад ДАІ не выявіў аўтамабіля і накіраваўся апытваць заяўніка.

Падчас гутаркі той самы транспартны сродак выпадкова праязджаў міма экіпажа і быў спынены міліцыянерамі. За рулём сапраўды знаходзіўся мужчына, пазбаўлены пасведчання кіроўцы, але ён быў цвярозы. Гаспадар іншамаркі сядзеў побач. У выніку было прынята рашэнне скласці пратаколы на абодвух вяскоўцаў: у дачыненні да кіроўцы — за бяспраўнае ваджэнне транспартнага сродку, а ў дачыненні да гаспадара — за перадачу кіравання машынай такой асобе.

Заяўнік, які назіраў за разглядам, быў п'яны, і яму не спадабалася прынятае інспектарам рашэнне. Прычынай таму стала затоеная крыўда — мужчыну сёлета пазбавілі правоў за п'янае ваджэнне. Цяпер ён патрабаваў ад супрацоўнікаў ДАІ прымяніць такую ж меру і ў дачыненні да затрыманых правапарушальнікаў.

Вяскоўца прасілі супакоіцца, але той аказаў актыўны супраціў і адарваў супрацоўніку пагон. Падчас затрымання за мужчыну ўступілася цешча, якая ўзяла металічны дыск і ўдарыла інспектара, прычыніўшы яму цялесныя пашкоджанні.

Дзеянням жанчыны следчыя далі прававую ацэнку і распачалі крымінальную справу за гвалт у дачыненні да супрацоўніка органаў унутраных спраў. У дачыненні да мужчыны праводзіцца праверка, яго дзеянням таксама будзе дадзена прававая ацэнка.

## ВЫРАТАВАЛІ 70 ЦЯЛЯТ

**Паведамленне аб пажары ў вёсцы Пузырова Аршанскага раёна паступіла ратавальнікам у канцы рабочага дня.**

Калі падраздзяленні МНС прыбылі да месца выкліку, высветлілася, што гарыць дах цялятніка. У будынку знаходзіліся 70 цялят ва ўзросце ад шасці да сямі месяцаў. Ратавальнікамі сумесна з вартаўніком прадпрыемства жывёлы былі выведзеныя з задымленай зоны на вуліцу. Пацярпелых няма, паведамляе МНС.

Пажар быў лакалізаваны і ліквідаваны. У выніку агнём у будынку цялятніка пашкоджаны дах, вароты, столевае перакрыцце, закураны сцены. Прычына здарэння высвятляецца. Версія, якая разглядаецца, — парушэнне правілаў эксплуатацыі электрасетак і электраабсталявання.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

Гатоўнасць № 1

# «ПРАПУСКНЫ ФІЛЬТР» І МАКСІМАЛЬНАЕ РАЗ'ЯДНАННЕ

**Рэспубліканскі цэнтр гігіены, эпідэміялогіі і грамадскага здароўя распрацаваў метадычныя рэкамендацыі па арганізацыі адукацыйнага працэсу ў 2020/2021 навучальным годзе ва ўмовах распаўсюджвання COVID-19. Пра гэта паведаміла журналістам урач-гігіеніст аддзялення гігіены дзяцей і падлеткаў Цэнтра Ангеліна МІЦКОВІЧ.**

— Мы плануем, што ўвойдзем у навучальны год у звычайным рэжыме, але калі спатрэбіцца, то да сустрэчы з COVID будзем падрыхтаваныя, — падкрэсліла медык.

Рэкамендацыі прызначаныя для прымянення ва ўсіх тыпах устаноў адукацыі для дзяцей і дарослых — незалежна ад іх формы ўласнасці і ведамаснай прыналежнасці. Асобныя палажэнні могуць выкарыстоўвацца ў дзейнасці іншых устаноў і арганізацый (дамоў дзіцяці, стацыянарных дамоў-інтэрнатаў для дзяцей-інвалідаў з асаблівасцямі псіхафізічнага развіцця, спецыялізаваных вучэбна-спартыўных устаноў для дзяцей).

У перыяд распаўсюджвання каранавіруса дакумент прадугледжвае комплекс мерапрыемстваў, накіраваных на зніжэнне рызыкі заражэння COVID-19. Па-першае, гэта максімальнае раз'яднанне дзяцей пры навучанні, пражыванні, арганізацыі сну, харчавання, захаванне прынцыпаў сацыяльнага дыстанцыравання. Наведванне выхаванцамі сталоўкі і гардэроба павінна адбывацца па максімальна раз'яднаным графіку. Правядзенне масавых мерапрыемстваў (культурных, спартыўных і фізкультурна-аздараўленчых) — пераважна на адкрытым паветры. Замацаванне за кожным вучэбным класам (вучэбнай групай) канкрэтнага памяшкання. Павелічэнне працягласці перапынкаў і перазменак, у тым ліку ва ўстановах адукацыі з двухзменным рэжымам работы не менш чым на пяць хвілін. Пераход па магчымасці на двухзменны рэжым работы пры арганізацыі навучальнага працэсу ў адну змену. Выключэнне па магчымасці выкарыстання агульных тэлефонаў, камп'ютарнай тэхнікі, абсталявання лінгафонных кабінетаў (навушнікаў) або пры неабходнасці іх выкарыстання дэзынфекцыя да пачатку работы і пасля яе заканчэння.

Абмяжоўваецца правядзенне бацькоўскіх сходаў і асабістых сустрэч педагагічных работнікаў з бацькамі (законнымі прадстаўнікамі) навучэнцаў. Для зносін рэкамендуецца выкарыстоўваць тэлефоны, электронную пошту і іншыя спосабы сувязі. Гэта ж датычыцца і рабочых нарад і мерапрыемстваў, якія лепш праводзіць у фармаце відэаканферэнцый (з выкарыстаннем сродкаў відэасувязі).

Перад пачаткам рабочага дня арганізуецца так званы «прапускны фільтр»: у работнікаў будуць вымяраць тэмпературу цела (пераважна з выкарыстаннем бесконтактавых тэрмометраў), апытваць пра наяўнасць прыкмет рэспіраторных захворванняў. Навучэнцаў і работнікаў з прыкметамі рэспіраторнай інфекцыі (кашаль, насмарк, павышаная тэмпература цела і г. д.) не дапусцяць да вучобы ці работы.

У кожнай установе адукацыі з улікам яе тыпу, умоў і асаблівасцяў рэжыму дзейнасці будзе распрацаваны адпаведны план мерапрыемстваў па прадухіленні COVID-19.

**Надзея НІКАЛАЕВА.**

Год малой радзімы

# Юная даследчыца ігуменскіх тапонімаў

**Мінчанка Арына Клімовіч яшчэ школьніцай падрыхтавала і выпусціла ў мінскім выдавецтве «Белпрынт» кнігу «Тапонімы роднага краю». Адбылося гэта ў 2018 годзе.**

Выданне прысвечана тапанімічнай гісторыі старажытнага Ігуменскага (былі такі павет — Ігуменскі, з цэнтрам у Ігумені альбо сучасным Чэрвені) мястэчка Пухавічы. З прадмовай да кнігі выступіў пісьменнік Уладзімір Барысенка. І вось што ён, у прыватнасці, напісаў: «Адразу хачу сказаць, што мяне вельмі ўразіў гэты твор шаснаццацігадовай дзяўчынкі Арыны Клімовіч, без перабольшвання, гэта магла б быць дыпломная работа студэнта-філолага, якая заслугоўвае ўвагі, бо асноўваецца не толькі на даследаваннях навукоўцаў, звестках з інтэрнэту, але і на памяці носьбітаў аб малой радзіме. Апошняе асабліва цікавае, бо кранае нейкія таямніцы роднага краю, якія ў зусім недалёкія часы замоўчваліся і нават пра іх было небяспечна гаварыць...»

У кнізе быў намаляваны цікавы тапанімічны партрэт Пухавіч і ваколіц. Побач з мястэчкам — унікальныя па сваім жыццяпісе вёскі Зацітава Слабада, Раўчак. Маладая даследчыца звяртае ўвагу і на паселішча, якое сышло з явы — вёску Грабаўё. Яна знікла з карты Пухавіцкага раёна, здаецца, на пачатку 1970-х гадоў.

Другое выданне «Тапонімаў роднага краю» нашмат пашырана. Калі ў першым — 60 старонак, то ў другім — 96 старонак. І важнай акалічнасцю з'яўляецца тое, што ў новым выданні краязнаўчай кнігі Арына Клімовіч больш выразна акрэслівае повязь тапонімаў з сацыяльнай і палітычнай гісторыяй роднай старонкі. Дарэчы, першае выданне кнігі «Тапонімы роднага краю», нягледзячы на невялікі наклад — усяго 30 асобнікаў, было адзначана рэцэнзіямі ў перыядычным друку, згадкамі ў Інтэрнэт-прасторы. Хацелася б, каб літаральна ўсе пухавічане звярнулі ўвагу на кнігу і па магчымасці сталі яе ўважлівымі чытачамі. «Тапонімы роднага краю» — яшчэ і добры прыклад для моладзі, якая цікавіцца гісторыяй роднай старонкі, як вывучаць малую радзіму.

**Сяргей ШЫЧКО.**

Вышэйшая школа

# ВОЧНЫ ФАРМАТ ПЛЮС ТЭХНАЛОГІІ

**1 верасня Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт сустрэне больш за пяць тысяч першакурснікаў.**

Сярод абітурыентаў 2020 года 85,3 % мелі пры залічэнні больш за 300 балаў. Традыцыйна самыя высокія прахадныя балы склаліся на факультэце міжнародных адносін: «міжнароднае права» (386), «міжнародныя адносіны» і «лінгвакраіназнаўства» (па 382). Таксама на 15 чалавек узрасла колькасць абітурыентаў, якія заявілі ў прыёмную камісію 100-бальныя сертыфікаты ЦТ. Яшчэ адной адметнасцю прыёмнай кампаніі стала павелічэнне колькасці прынятых без экзаменаў — 159 чалавек.

Як паведаміў падчас брыфінгу **рэктар БДУ Андрэй КАРОЛЬ,** навучальны працэс будзе праходзіць ва ўніверсітэце ў класічным вочным фармаце і з выкарыстаннем Адукацыйнага партала Moodle. На сённяшні дзень інфармацыйна-камунікацыйныя тэхналогіі (ІКТ) прымяняюцца ў больш чым 2000 навучальных праграм БДУ. Яны прадугледжваюць не капіраванне гатовай інфармацыі, а стварэнне новых метадалагічных, змястоўных і тэхналагічных падыходаў. Сёння ў БДУ для арганізацыі навучальнага працэсу з дапамогай ІКТ распрацаваны метадычныя рэкамендацыі, майстар-класы, працуе «Педагагічная майстэрня анлайн-навучання».

У новым навучальным годзе студэнцкая моладзь будзе пражываць у дзевяці інтэрнатах БДУ. Усяго для іх выдзелена звыш васьмі тысяч месцаў, такім чынам дахам над галавой будзе забяспечана каля 77 % ад агульнай колькасці ўсіх, хто мае ў гэтым патрэбу. Акрамя таго, студэнтам БДУ прапануюць дадатковыя 350 месцаў у інтэрнатах іншых універсітэтаў і прадпрыемстваў сталіцы.

Дарэчы, у двух інтэрнатах БДУ быў праведзены капітальны рамонт, у астатніх — касметычны: клеілі шпалеры, фарбавалі падлогі, ліфтавыя, фасады, сталі, сцены і вокны, рамантавалі і рэстаўравалі мэблю, добраўпарадкавалі прылеглую да інтэрнатаў тэрыторыю. Разам з падраднымі арганізацыямі ў добраўпарадкаванні інтэрнатаў удзельнічалі і студэнты. Будатрад па падрыхтоўцы інтэрнатаў да новага навучальнага года налічваў 180 чалавек.

У Белдзяржуніверсітэце па ініцыятыве Студэнцкага гарадка функцыянуе электронны банк даных аб кватэрах і пакоях, якія здаюцца ў наём для студэнтаў БДУ. Гэта інфармацыя размешчана ў асабістым кабінеце студэнта ў раздзеле «Інтэрнаты» і даступная ў рэжыме анлайн. Акрамя таго, для аператыўнага рэагавання на пытанні, якія датычацца засялення, у Студэнцкім гарадку да 31 жніўня будзе працаваць тэлефонная «гарачая лінія» (па буднях з 9.00 да 12.00 і з 14.00 да 17.00, тэлефон 209-56-56). Адказы на пытанні, якія цікавяць, таксама можна атрымаць у сацыяльных сетках Студэнцкага гарадка.

У першую чаргу магчымасць пражывання ў інтэрнатах атрымаюць студэнты, у якіх ёсць ільготы ў адпаведнасці з заканадаўствам Рэспублікі Беларусь, а таксама тыя, хто ўваходзіць у катэгорыю сацыяльна неабароненых грамадзян. Далей у інтэрнаты засяляюцца навучэнцы, якія праявілі сябе ў навукова-даследчай, спартыўнай, культурна-масавай, грамадскай дзейнасці і з найбольш высокім балам паспяховасці.

**Надзея НІКАЛАЕВА.**

У цэнтры ўвагі

# ДЗЕЦІ НА ДАРОЗЕ: КІРОЎЦАМ НЕ РАССЛАБЛЯЦЦА!

**Канец жніўня, пачатак верасня — самы небяспечны па рызыцы здзяйснення ДТЗ перыяд. Дзеці, якія цяпер вяртаюцца з адпачынку ў горад, вельмі расслабленыя, ім праблематычна сканцэнтраваць увагу і кантраляваць сітуацыю на дарозе. Таму дарослым трэба ім дапамагчы — прайсці разам да навучальнай установы і паказаць усе небяспечныя ўчасткі з інтэнсіўным аўтатранспартным рухам.**



Як расказала **старшы інспектар па асаблівых даручэннях галоўнага ўпраўлення ДАІ МУС Ганна БАНАДЫК,** усяго за летнія месяцы па дарогах краіны загінулі пяць дзяцей, яшчэ 103 непаўналетніх атрымалі траўмы.

Спецыяліст адзначыла, што ў цэлым па краіне за сем месяцаў зменшылася колькасць ДТЗ з удзелам непаўналетніх. Разам з тым назіраецца невялікі рост колькасці загінулых. Са студзеня да ліпеня ў 204 дарожна-транспартных здарэннях загінулі 13 дзяцей і 212 атрымалі траўмы. З 13 загінулых 8 дзяцей былі пасажырамі транспартных сродкаў, трое — пешаходамі і двое — веласіпедыстамі.

А вось статыстыка, якая прымушае задумацца: 72 % дарожна-транспартных здарэнняў з удзелам непаўналетніх адбылося па віне кіроўцаў. Калі дзесяць гадоў таму дзеці часцей выступалі ў ролі парушальнікаў і 80 працэнтаў здарэнняў здзяйснялася па іх віне, то цяпер складваецца сітуацыя з дакладнасцю да наадварот.

99 непаўналетніх сталі ўдзельнікамі ДТЗ і атрымалі траўмы ў якасці пешаходаў (трое з іх загінулі і 96 атрымалі траўмы). Ганна Банадык звяртае ўвагу на тую акалічнасць, што з 99 дзяцей 49 атрымалі траўмы на пешаходных пераходах: 33 — на нерэгуляваных і 16 — на рэгуляваных.

— Мы навучылі школьнікаў пераходзіць дарогу па пешаходным пераходзе, і цяпер вельмі шмат залежыць ад увагі кіроўцаў, якія не заўважаюць дзяцей з-за іх невысокага росту або не гатовыя да іх раптоўнага з'яўлення на дарозе, — заўважыла Ганна Банадык. — чатырнаццаць непаўналетніх пешаходаў перасякалі праезную частку па-за пешаходнымі пераходамі, дваццаць раптоўна выбеглі на дарогу, шэсць атрымалі траўмы, рухаючыся па абочыне або па краі праезнай часткі, дзевяць дзяцей былі траўміраваныя ў двары і адзін малы — на прыпынку грамадскага транспарту.

27 непаўналетніх сталі ўдзельнікамі ДТЗ у якасці веласіпедыстаў (двое загінулі і 25 — параненыя). Здараецца, хоць і не часта, што ДТЗ здзяйсняюць непаўналетнія, якія кіруюць аўтамабілем, мапедам або матацыклам.

На словах старшага інспектара, на працягу двух летніх месяцаў праводзіліся абследаванні вулічнай дарожнай сеткі паблізу ўстаноў дашкольнай і сярэдняй адукацыі. Асноўным выяўленым недахопам стала адсутнасць ці неналежны стан дарожных знакаў — такіх парушэнняў было больш за 2,5 тысячы. Разам з гэтым была выяўлена патрэба ва ўсталяванні штучных няроўнасцяў паблізу 170 устаноў адукацыі, тратуараў — паблізу 235 і вонкавага асвятлення — паблізу 159 устаноў адукацыі.

Ганна Банадык нагадала, што напярэдадні новага навучальнага года ў Беларусі праходзіць акцыя «Увага — дзеці!». Для прафілактыкі парушэнняў правіл дарожнага руху і забеспячэння парадку паблізу школ з 1 верасня будуць арганізаваны дзяжурствы міліцыянераў. Нарады ДПС таксама пракантралююць пропуск пешаходаў, выкананне правіл прыпынку і стаянкі, перавозкі дзяцей.

А 28 жніўня па ўсёй краіне пройдзе Адзіны дзень бяспекі дарожнага руху пад дэвізам: «Будзьце прыкладам свайму дзіцяці!». Як паведаміла прадстаўнік ведамства, з мэтай прыцягнення ўвагі юных удзельнікаў дарожнага руху да транспартных сродкаў, што набліжаюцца, на момант правядзення спецмерапрыемстваў МУС рух транспартных сродкаў у светлы час сутак павінен ажыццяўляцца з уключаным блізкім святлом фар.

**Надзея НІКАЛАЕВА.**

# «Для нас вялікі гонар, што Адамовіч нарадзіўся ў Канюхах»



*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

«Самае таямнічае, легендарнае месца ў маёй біяграфіі — гэтыя самыя Канюхі, у іх я нарадзіўся... Я нічога з канюхоўскага жыцця не памятаю...» — пісаў Алесь Адамовіч у сваёй апошняй кнізе «Vixi» («Пражыта»). Будучы пісьменнік з'явіўся тут на свет 3 жніўня 1926 года. Да нядаўняга часу нічога ў вёсцы Канюхі пра гэта не нагадвала. Толькі зусім нядаўна прыпынак пры ўездзе ў вёску, які знаходзіцца на трасе Капыль — Грэск, ператварыўся ў сімвалічны арт-аб'ект: выява пісьменніка на бела-блакітным фоне, стылізаваны лес, карта з пазначанымі на ёй літаратурнымі мясцінамі і прысвечаныя вёсцы адамовіцкія словы...

Гаворка пра тое, каб неяк ушанаваць памяць славутага ўраджэнца Канюхоў, вялася даўно. Дачка пісьменніка Наталля Адамовіч згадвае, як аднойчы ёй патэлефанавала жанчына са знакавым прозвішчам Корзун — менавіта такое было ў галоўнай героіні дылогіі Алеся Адамовіча «Партызаны». Яшчэ большым узрушэннем было, калі яна прапанавала ўвекавечыць імя Алеся Адамовіча ў памятным знаку. Прадпрымальнік Анатоль Самусевіч, былы выхаванец дзіцячай школы-інтэрната ў Канюхах, нават ужо шукаў для гэтага прыдатны камень, каб на ім потым замацаваць мемарыяльную дошку. Але тады нічога не атрымалася. Ідэя аб ушанаванні славутага ўраджэнца зноў прагучала праз 16 гадоў. І вось зусім нядаўна звычайны прыпынак з назвай «Канюхі» атрымаў новы выгляд. Прыхільнікі творчасці Алеся Адамовіча і захавальнікі яго памяці ў Канюхах Таццяна і Віктар Корзуны ўзялі ініцыятыву ў свае рукі. З гэтай парай мы сустракаліся роўна год таму, калі яны арганізавалі для карэспандэнта «Звязды» і Наталлі Адамовіч экскурсію па вёсцы і паказалі ўсе звязаныя з імем пісьменніка мясціны. Памятаю, з якімі цёплымі пачуццямі мы ад'язджалі адтуль і выказвалі спадзяванні калісьці зноў вярнуцца да гэтай тэмы. Цяпер нагода знайшлася.

Да дзеяння Таццяну і Віктара падштурхнула ўсё тая ж Глуша, дзе намаганнямі Андруся Архіпенкі з'явіўся не толькі прыпынак, але і паўнавартасны помнік.

— Сорамна стала, што на радзіме пісьменніка, у Канюхах, нічога пра яго не нагадвае, — кажа Таццяна. — У Глушы нам вельмі спадабалася ідэя з прыпынкам. Мы вырашылі рэалізаваць нешта падобнае ў нас.

Сужэнцы звярнуліся па дапамогу ў капыльскае ДРБУ № 124 — філіял «Мінскаблдарбуд». У якасці аргумента яны заявілі, што гэты арт-аб'ект патрэбны, каб развіваць турыстычны патэнцыял населенага пункта і наогул раёна. Сапраўды: Адамовіч асоба вядомая, і ў яго творчасці шмат прыхільнікаў, якія, магчыма, пажадаюць пабываць там, дзе нарадзіўся пісьменнік. Начальнік філіяла Іван Заяц з гэтым пагадзіўся. Параіў толькі звязацца са сталічным кіраўніцтвам, каб афіцыйна заключыць пагадненне. Там таксама не пярэчылі — трэба было толькі ўзгадніць эскіз і вызначыць адказнага за мастацкае афармленне. Накont таго, як прыпынак павінен выглядаць, натхняльнікі праекта перш за ўсё раіліся з Наталляй Адамовіч. Яна перадала ім некалькі варыянтаў фота свайго бацькі і тэкст.

— Для мяне было вельмі прыемна, што прыклад Глушы, дзе быў ужо рэалізаваны такі праект, атрымаў працяг, — кажа дачка пісьменніка. — Тата толькі нарадзіўся ў Канюхах, яго бацька-студэнт падпрацоўваў фельчарам у мясцовым доме адпачынку. Праз два гады сям'я пераехала ў Глушу, куды маладога спецыяліста накіравалі па размеркаванні. Але ў памяці маленькага хлопчыка засталася і гэта назва, і нават нейкі мядзведзь, якога нібыта ён там бачыў. Гэта дзіўна, бо што можа запомніць двухгадовае дзіця? Але пра гэта ён згадаў у сваёй кнізе «Vixi». А яшчэ пра тое, як прыехаў туды праз 40 гадоў і сустрэўся з жыхарамі. І калі адна жанчына паскардзілася, што яе дачцэ штамп «Канюхі» ў пашпарце ўсё жыццё сапсуе, паказаў ёй свой з такой жа назвай.

Праілюстраваць прыпынак вырашылі выявай з дымка таго перыяду, калі Адамовіч прыязджаў ў Канюхі ўжо вядомым пісьменнікам. Ён тады наноў знаёміўся з роднай вёскай, шукаў вачыма «сад, дом з белымі калонамі» — такім, як ён пісаў, «малявала фантазія «Дом адпачынку» майго дзяцінства»... Акрамя партрэта на бетоннай сцяне «шуміць» той самы «таямнічы» глушанскі лес, што «пачынаўся за высокай агароджай Пагоцкіх», лес, які падчас акупацыі хаваў партызан ад нямецкай расправы. І як сімвал непакорнасці ворагу страха дома — надзея, што сыны абавязкова вернуцца.

Стварaць эскіз Таццяне і Віктару дапамагалі іх сыны — Павел і Ягор.

Спачатку не было грошай, каб рэалізаваць ідэю. Таццяна і Віктар ужо думалі, калі ніхто не адгукнецца, пачаць рабіць справу за свой кошт. Але ахвотных далучыцца аказалася дастаткова. Сужэнцаў падтрымалі калегі-настаўнікі, аднавяскоўцы і нават былыя жыхары. Міхаіл Новік, напрыклад, мінчанін, але родам з Канюхоў. Ён адзін з тых, хто ўнёс у агульную скарбонку адчувальную суму грошай. Наогул кожны дапамагаў чым мог. З будматэрыяламі выручыў кіраўнік ААТ «Праснакі» Віталь Платун. Актыўна ўключыліся ў работу супрацоўнікі Грозаўскага псіханевралагічнага дома-інтэрната на чале з яго дырэктарам Ірынай Давідоўскай. Тынкавальныя работы Віктару Корзуну дапамагалі рабіць Дзмітрый Стаяновіч і Мікалай Корбут. А партрэт Алеся Адамовіча маляваў пастаялец дома-інтэрната Віктар Бураў. Мужчына падышоў да справы з усёй адказнасцю. Таццяна Корзун намалявала літаратурную карту, а яе сужэнец напісаў вышэйзгаданую цытату.

На добраўпарадкаванні аб'екта працавалі вядучы інжынер ДРБУ № 124 Андрэй Леус, майстар Генадзь Захарык і яго брыгада. Менавіта дзякуючы ім тут з'явіўся новы асфальт і былі пакладзены бардзюры. Рэалізацыя праекта заняла два з паловай месяцы, але ўдзельнікі атрымалі задавальненне ад гэтай працы.

— Мы з мужам хадзілі сюды як на работу, — смяецца Таццяна Корзун. — Усё ж такі гэта была наша ініцыятыва, і мы павінны несці за яе адказнасць. І цяпер будзем глядзець за тым, каб прыпынак знаходзіўся ў парадку. Для мяне вялікае маральнае задавальненне, што мы ўсё ж такі змаглі зрабіць нешта для памяці Алеся Адамовіча. Гэта адзін з яскравых пісьменнікаў і публіцыстаў дваццатага стагоддзя, і інтарэс да яго вялікі. Тым, хто яго ведае, прыпынак нагадае пра творчасць пісьменніка, а тыя, хто не чуў гэта імя (бывае і такое), даведаюцца праз QR-код на сцяне. Адамовіч быў чалавекам праўды і сумлення і ніколі не стаяў убаку ад праблем. Для нас вялікі гонар, што ён тут нарадзіўся.

Прыпынак Алеся Адамовіча ў Канюхах, можна лічыць, народны. А гэта яшчэ адзін доказ таго, што беларусы шануюць і паважаюць сваіх пісьменнікаў. Гэты сімвалічны арт-аб'ект стаў першым крокам у падрыхтоўцы Капыльскага раёна да адказнага і знамянальнага мерапрыемства — Дня беларускага пісьменства, святкаванне якога тут адбудзецца налета.

**Нэлі ЗІГУЛЯ.**









**Нагадваем, што збор сродкаў на рэканструкцыю будынка аптэкі пад музей Алеся Адамовіча ў Глушы працягваецца. Разліковы рахунак існуе пры Бабруйскім райвыканкаме. Грошы трэба пералічваць на р/р BY84AKBB36421292723267100000 у філіяле 703 ААТ ААБ Беларусбанк, БІК AKBBBY21703, УНП 701226324. Прызначэнне плацяжу: «Для вырабу праектна-каштарыснай дакументацыі і рэканструкцыі будынка ў пасёлку Глуша пад музей А. Адамовіча». Гэты доўгі сказ павінен быць пазначаны ў банкаўскім дакуменце абавязкова.**

Грошы

# ПАШЫРАЮЦЦА МАГЧЫМАСЦІ

## ПА ДЫСТАНЦЫЙНЫМ ДЭПАЗІТАРНЫМ АБСЛУГОЎВАННІ

**У перыяд пандэміі сталі актыўна выкарыстоўвацца новыя фінансавыя паслугі, для аказання якіх не трэба асабістая прысутнасць кліента.**

### Атрымаць даведку аб сваіх даходах, седзячы на канапе

Днямі найбуйнейшы дэпазітарый краіны забяспечыў рознічным кліентам новыя магчымасці атрымання дэпазітарных паслуг у дыстанцыйным рэжыме. Цяпер у Беларусбанку ў сістэме «Інтэрнэт-банкінг» уведзены сэрвіс афармлення запытаў на атрыманне выпіскі па рахунку «дэпо» і даведкі аб атрыманых кліентам даходах па каштоўных паперах.

Для атрымання афіцыйных дакументаў у дачыненні да каштоўных папер не патрабуецца наведванне банкаўскай установы. На падставе электроннага запыту дэпазітарый банка аформіць іх на папяровым носьбіце і накіруе дакументы заказным лістом на пазначаны кліентам адрас.

Укараненне такой тэхналогіі з'яўляецца яшчэ адным крокам лічбавізацыі дзейнасці банка па аказанні паслуг на рынку каштоўных папер — кліентам ужо даступная магчымасць у рэжыме анлайн набываць аблігацыі банка і асобных карпаратыўных эмітэнтаў, а таксама адкрываць рахунак «дэпо» і сачыць за яго станам.

### Найменшыя страты кэшу

Развітая сетка Беларусбанка і банкаў-партнёраў дае кліентам шырокія магчымасці для зняцця наяўных грашовых сродкаў у любым горадзе Беларусі. Трымальнікі банкаўскіх плацежных картак гэтага банка могуць без спагнання ўзнагароджання здымаць наяўныя грашовыя сродкі ў аддзяленнях Беларусбанка, а таксама кругласутачна ў банкаматах Беларусбанка і банкаў-партнёраў: ААТ «БПС-Ашчадбанк» і ААТ «Белаграпрамбанк».

Акрамя таго, зняць наяўныя грашовыя сродкі па картцы банка магчыма і ў сетцы банкаматаў іншых банкаў. Пры гэтым звяртаем вашу ўвагу, што за правядзенне такой аперацыі будзе спаганяцца ўзнагароджанне — 2,5 % ад сумы грашовых сродкаў (мінімальна 3 адзінкі валюты (долар, еўра), 110 расійскіх рублёў, 3 беларускія рублі; па картцы БЕЛКАРТ для выкарыстання толькі на тэрыторыі Беларусі — мінімальная ўзнагарода — 0,50 беларускага рубля).

### Масава павышаюцца стаўкі па ўкладах

З 25 жніўня Беларусбанк устанаўлівае павышаныя стаўкі па тэрміновых банкаўскіх укладах у беларускіх рублях, якія адкрываюцца нанава. Што датычыцца фіксаванай стаўкі банка, то базавы дэпазіт «Класік Безадзыўны Яркі» цяпер прапануецца за 12,5 % гадавых, «Класік Безадзыўны Яркі On-line» — 12,51 %, «Вясновы (версія 2.0)» — 12,5 %, «Інтэрнэт-дэпазіт Вясновы (версія 2.0)» — 12,51 % гадавых.

Павысілася і лінейка адзыўных укладаў тэрмінам 3—7 месяцаў: цяпер іх магчыма захаваць, дадаючы да сумы дэпазіту ад 11,1 % да 11,41 % гадавых. Больш за ўсё цяпер можна атрымаць «навару» з безадзыўных укладаў. Яны прапануюцца на тэрмін ад 9 месяцаў да пяці гадоў. Мінімальная стаўка па такіх дэпазітах складае 12,2 % гадавых, а максімальная — 13,5 %. Праўда, гэта будзе злёгку гібкая працэнтная стаўка, бо яна будзе залежаць ад такога паказчыка Нацбанка, як СКА (стаўка крэдыту авернайт).

**Сяргей КУРКАЧ.**

Нюансы

# Рэалізаваць заклад

## цяпер могуць не толькі ламбарды

**У нашай краіне ўступілі ў сілу палажэнні Дэкрэта Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 21 мая 2020 года № 2, дзе прадугледжваецца спрашчэнне працэдуры накладання спагнання на закладзеную маёмасць і яго рэалізацыі юрыдычнымі асобамі, якія не з'яўляюцца мікрафінансавымі арганізацыямі. Гэтую інфармацыю паведаміла прэс-служба Нацыянальнага банка краіны.**

У дакуменце гаворыцца, што да ўказаных юрыдычных асоб адносяцца дзяржаўныя юрыдычныя асобы, якія аказваюць бытавыя паслугі насельніцтву і зарэгістраваныя ў сельскай мясцовасці, а таксама якія ажыццяўляюць скупку каштоўных металаў і камянёў для папаўнення Дзяржаўнага фонду каштоўных металаў і каштоўных камянёў Рэспублікі Беларусь.

У адпаведнасці з дэкрэтам юрыдычныя асобы, якія не з'яўляюцца мікрафінансавымі арганізацыямі, але маюць права ажыццяўляць адпаведную дзейнасць, надзелены правам у выпадку невяртання мікрапазыкі, забяспечанай закладам, самастойна накласці спагнанне на закладзеную рухомую маёмасць коштам менш за 100 базавых велічынь і яе рэалізаваць. Заўважым, раней такое права было дадзена толькі камерцыйным мікрафінансавым арганізацыям (ламбардам). Акрамя таго, дэкрэтам вызначаецца, што парадак ажыццяўлення ламбардамі і юрыдычнымі асобамі, якія маюць права ажыццяўляць мікрафінансавую дзейнасць, аперацый з каштоўнымі металамі і каштоўнымі камянямі вызначаецца Міністэрствам фінансаў.

Што гэта дае? Цяпер і на гэтыя юрыдычныя асобы, якія аказваюць бытавыя паслугі і скупляюць каштоўныя металы і каштоўныя камяні, распаўсюджваюцца нормы правілаў самастойнага накладання спагнання на рухомую маёмасць, якая прызначана для асабістага, сямейнага або хатняга выкарыстання, якой забяспечана выкананне абавязацельстваў па дамове мікрапазыкі і сума ацэнкі якой не перавышае 100 базавых велічынь, а таксама яе самастойнай рэалізацыі, устаноўлены для камерцыйных мікрафінансавых арганізацый (ламбардаў).

У Нацбанку лічаць, што спрашчэнне працэдуры накладання спагнання на закладзеную і невыкупленую маёмасць і яе рэалізацыі павысіць цікавасць юрыдычных асоб, якія аказваюць бытавыя паслугі і ажыццяўляюць скупку каштоўных металаў і каштоўных камянёў, да выдачы грамадзянам мікрапазык. Гэта, у сваю чаргу, будзе спрыяць павышэнню даступнасці названай фінансавай паслугі для насельніцтва.

**Сяргей КУРКАЧ.**

# Вакцынацыя супраць грыпу пачнецца ў верасні

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

У Міністэрстве аховы здароўя звярнулі ўвагу, што найперш небяспеку тоіць спалучэнне каранавіруснай інфекцыі COVID-19 і сезоннага грыпу. Абодва вірусы неспрыяльна ўздзейнічаюць, перш за ўсё, на лёгачную тканку, выклікаючы пнеўманіі. Даказаным з'яўляецца развіццё пасля грыпу такіх ускладненняў, як міякардыт, сінусіт, атыт, трахеіт, менінгіт, энцэфаліт, міязіт і іншыя, якія могуць скончыцца неспрыяльна. Абедзве інфекцыі дрэнна ўплываюць на любога чалавека, але найбольш небяспечныя для людзей старэйшага ўзросту, цяжарных жанчын і асоб з любымі хранічнымі захворваннямі.

> Пакуль у нас няма магчымасці абараніцца ад інфекцыі COVID-19 з дапамогай вакцыны, але кожны можа дапамагчы сабе не захварэць на грып, зрабіўшы прафілактычную прышчэпку.

— Шматлікія незалежныя даследаванні і аналізы міжнароднага ўзроўню даказваюць безумоўную выгаду вакцынацыі супраць грыпу. Карысць тут найперш індывідуальная, бо 7—9 чалавек з кожных 10 прышчэпленых не захварэюць на грып. Калі ж прышчэплены чалавек усё-такі заразіцца, то захворванне не будзе працякаць у цяжкай форме: такі чалавек менш дзён правядзе на бальнічным, у яго не разаўюцца ўскладненні, якія прыводзяць да непажаданых вынікаў. Але карысць яшчэ і грамадская, бо вакцынацыя нашмат таннейшая за лячэнне, прадухіляе велізарную нагрузку на медыцынскія ўстановы ў перыяд уздыму захваральнасці, што набывае ў цяперашніх умовах асаблівае значэнне, — падкрэсліваюць у Міністэрстве.

## У СЁЛЕТНЯЙ ВАКЦЫНЕ ЗАМЯНІЛІ ТРЫ КАМПАНЕНТЫ

Вядома, што вірусы грыпу пастаянна муціруюць. За іх уласцівасцямі назіраюць нацыянальныя і міжнародныя лабараторыі і цэнтры — яны праводзяць глабальнае прагназаванне і высвятляюць, якія штамы вірусаў будуць лідзіраваць у гэтым сезоне, а вытворцы ўключаюць гэтыя штамы ў састаў вакцын. Дык вось у 2020 годзе спецыяльная камісія Сусветнай арганізацыі аховы здароўя замяніла адразу тры кампаненты вакцын, рэкамендаваных для сезону 2020/2021.

Для ўсіх вытворцаў рэкамендаваны наступны канчатковы састаў трохкампанентных сезонных вакцын супраць грыпу для выкарыстання ў сезоне 2020/2021 у Паўночным паўшар'і: вірус, падобны да A / Guangdong-Maonan / SWL1536 / 2019 (H1N1) pdm09; вірус, падобны да A / Hong Kong / 2671/2019 (H3N2); вірус, падобны да B / Washington / 02/2019 (B / Victoria lineage). У састаў чатырохкампанентных вакцын уключаны яшчэ адзін кампанент (аналагічны вакцыне ў сезоне 2019/2020): вірус, падобны на B / Phuket / 3073/2013 (B / Yamagata lineage).

Спецыялісты нагадваюць, што вакцынацыя супраць грыпу патрэбна ўсім. У тым ліку яе можна рабіць і дзецям, пачынаючы з шасцімесячных і далей без абмежавання ўзросту (пры адсутнасці супрацьпаказанняў).

## ПАДРЫХТОЎКІ ПЕРАД ПРЫШЧЭПКАЙ НЕ ПАТРАБУЕЦЦА

Спецыяльнага абследавання або медыкаментознай падрыхтоўкі перад прышчэпкай не патрабуецца. Адзіным абсалютным супрацьпаказаннем да прышчэпкі супраць грыпу з'яўляецца цяжкая алергічная рэакцыя (напрыклад, анафілактычны шок) на папярэднюю дозу вакцыны, што сустракаецца вельмі рэдка (па звестках з літаратуры — 0,07 выпадку на 100 тысяч доз), прычым пераважна на ўвядзенне «жывых» вакцын. У сувязі з такой нізкай частатой гэтых рэакцый і невыкарыстаннем у практыцы ў апошнія гады «жывых» супрацьгрыпозных вакцын можна казаць аб практычнай адсутнасці асоб, якія маюць абсалютныя медыцынскія супрацьпаказанні.

> Адкласці вакцынацыю медыкі раяць, калі ў вас цяжкае вострае захворванне ці абвастрылася хранічная хвароба. Але гэта не падстава адмовіцца ад прышчэпкі, а ўсяго толькі нагода зрабіць яе пазней. У любым выпадку ўрач прызначыць працэдуру толькі пасля таго, як ацэніць ваш стан, анамнез і ўлічыць магчымыя супрацьпаказанні.

У Міністэрстве аховы здароўя нагадваюць, што зрабіць прышчэпкі ўсяму насельніцтву ў любой краіне за 2–3 месяцы немагчыма. Таму Сусветная арганізацыя аховы здароўя рэкамендуе ў якасці мінімальнай задачы ахапіць не менш за 75 % насельніцтва з груп рызыкі. У першую чаргу гэта дзеці ва ўзросце ад шасці месяцаў да трох гадоў, усе дзеці ад трох гадоў і дарослыя з хранічнымі захворваннямі і імунадэфіцытнымі станамі, асобы, старэйшыя за 65 гадоў, цяжарныя жанчыны, медыцынскія і фармацэўтычныя работнікі, дзеці і дарослыя, якія знаходзяцца ва ўстановах з кругласутачным рэжымам знаходжання, работнікі дзяржаўных органаў, якія забяспечваюць бяспеку дзяржавы і жыццядзейнасць



насельніцтва. Акрамя гэтага, вакцынацыя важная для работнікаў «грамадскіх» сфер дзейнасці — адукацыі, гандлю, грамадскага харчавання, грамадскага транспарту, камунальнай сферы.

## ПЛАНУЕЦЦА ПРЫШЧАПІЦЬ 40 % НАСЕЛЬНІЦТВА

У 2020 годзе ў нашай краіне плануецца прышчапіць не менш за 40 % ад усяго насельніцтва і не менш за 75 % з пералічаных груп рызыкі.

Аптымальны эфект захоўваецца на працягу першых трох—шасці месяцаў пасля прышчэпкі. Таму тэрміны вакцынацыі накіраваны на дасягненне максімальнага ўзроўню аховы ў пік рэспіраторных інфекцый, які звычайна прыпадае на люты—сакавік. Вакцынацыя з верасня да лістапада забяспечвае ахову на працягу пікавага сезона.

— Існуе шэраг навуковых звестак пра тое, што прышчэпка ад грыпу можа аказаць станоўчы эфект у прадухіленні інфекцыі COVID-19. Вакцынацыя сучаснымі ад'ювантнымі вакцынамі суправаджаецца не толькі фарміраваннем спецыфічных антыцел да штамаў віруса грыпу,

> **Няма сумненняў, што вакцынацыя супраць грыпу гэтай восенню будзе важнейшая, чым калі-небудзь раней.**

але і ранняй актывацыяй клетачных механізмаў супрацьвіруснага імуннага адказу, які прыводзіць да зніжэння захваральнасці на грып і ВРІ, і, цалкам верагодна, на каранавірусную інфекцыю, — звяртаюць увагу ў аддзеле гігіены, эпідэміялогіі і прафілактыкі Міністэрства аховы здароўя.

Няма сумненняў, што вакцынацыя супраць грыпу гэтай восенню будзе важнейшая, чым калі-небудзь раней. «Яна забяспечвае індывідуальную перавагу для вашага здароўя, прадухіляючы захворванне на грып, зніжаючы цяжар хваробы і рызыку магчымай шпіталізацыі. Прышчэпка супраць грыпу паменшыць агульнае ўздзеянне рэспіраторных захворванняў на насельніцтва і нагрузку на сістэму аховы здароўя падчас цыркуляцыі інфекцыі COVID-19», — заявіў на прэс-брыфінгу дырэктар Еўрапейскага рэгіянальнага бюро СААЗ Ханс Клюге.

**Алена КРАВЕЦ.**

# Мы разам — Беларусь!





Краіна моцная рэгіёнамі: Мазырскі раён

# БУДАЎНІЧЫ БУМ НА МАЗЫРШЧЫНЕ



**Старшыня Мазырскага райвыканкама Алена ПАЎЛЕЧКА** — адна з нямногіх жанчын у краіне, якія ўзначальваюць раённую вертыкаль улады. Яна пачынала сваю працоўную дзейнасць на малой радзіме, у Нараўлянскім раёне. Прайшла шлях ад бухгалтара адной з мясцовых гаспадарак да галоўнага эканаміста, закончыла Беларускую дзяржаўную сельскагаспадарчую акадэмію. Аварыя на Чарнобыльскай АЭС унесла карэктывы ў жыццё тысяч людзей, у тым ліку і жыхароў малой радзімы Алены Паўлечкі — вёскі Кіраў. Населены пункт трапіў у спіс на першачарговае адсяленне. У 1995 годзе Алена Фёдараўна з сям'ёй пераехала ў Мазырскі раён. У яе працоўнай біяграфіі — кіруючыя пасады ва ўпраўленні сельскай гаспадаркі і харчавання Мазырскага райвыканкама. З 2016 года Алена Паўлечка — кіраўнік аднаго з найбуйнейшых раёнаў Гомельскай вобласці.

## МАЗЫРШЧЫНА — ТЭРЫТОРЫЯ БЯЗМЕЖНЫХ МАГЧЫМАСЦЯЎ

**Мазырскі раён — адзін з самых буйных у Гомельскай вобласці. Не толькі па плошчы — яна складае 160 тысяч гектараў, — але і па наяўнасці горадаўтваральных прадпрыемстваў. Яны, вядома, вызначаюць узровень развіцця рэгіёна ўвогуле і дабрабыту кожнага са 127 тысяч яго жыхароў. Многія прадпрыемствы раёна вядомыя не толькі на Гомельшчыне, але і ва ўсёй Беларусі, і за мяжой. Яны прадстаўляюць практычна ўсе галіны народнай гаспадаркі: нафтаперапрацоўку, вытворчасць малочных і мясных прадуктаў, солі, машын і абсталявання, кабеляў, швейных вырабаў... Бясспрэчна, Мазыршчына аказвае значны ўплыў на сацыяльна-эканамічнае развіццё як Гомельскага рэгіёна, так і краіны цалкам.**

Другі год запар Мазырскі раён занесены на рэспубліканскую Дошку гонару — гэта высокая адзнака, якая дадзена ўзроўню развіцця тэрыторыі Прэзідэнтам і Саветам Міністраў Рэспублікі Беларусь. Дабівацца поспехаў у выкананні сацыяльна-эканамічных паказчыкаў дапамагае зладжаная работа выканаўчай улады, кіраўнікоў прадпрыемстваў, устаноў, працоўных калектываў і жыхароў раёна ў цэлым, упэўнена старшыня Мазырскага райвыканкама Алена Паўлечка.

— За 2019 год у аб'ёме прамысловай вытворчасці Гомельскай вобласці доля Мазырскага раёна — 43,5 %. Імкнёмся штогод нарошчваць вытворчыя магутнасці, а для гэтага — праводзім мадэрнізацыю і тэхнічнае пераўзбраенне нашых прадпрыемстваў, — адзначае яна. — У 2019 годзе ў раёне інвестыцыі ў асноўны капітал склалі больш за 791 мільён рублёў. За шэсць месяцаў бягучага года гэты паказчык ацэнены ў 359 мільёнаў рублёў, або 91,3 % ад запланаванага. Трэба адзначыць, што 74 % прадукцыі прамысловасці, якая выпрабляецца ў Мазырскім раёне, пастаўляецца на экспарт, — дадае суразмоўніца, — а гэта звыш 280 мільёнаў долараў ЗША. За студзень—чэрвень бягучага года абъём прамысловай вытворчасці ў Мазырскім раёне ацэнены амаль у 2,797 мільярда рублёў. Удзельная вага вытворчага прадукту раёна ад агульнага па Гомельскай вобласці склала 32 %.

**На 1 студзеня 2020 года на тэрыторыі Мазырскага раёна сваю дзейнасць вялі амаль 2,8 тысячы індывідуальных прадпрымальнікаў, каля 1,6 тысячы юрыдычных асоб.**

Між тым распрацаваны і паспяхова рэалізуецца комплексны план паскоранага сацыяльна-эканамічнага развіцця Мазырскага раёна.

Алена Паўлечка падкрэслівае, што асноўная задача, якая пастаўлена перад раёнам, — шукаць пункты росту эканамічнага патэнцыялу і фарміраваць аснову для ўстойлівага росту:

— У прыярытэце, безумоўна, узровень жыцця жыхароў нашага раёна — дабрабыт людзей, камфортныя ўмовы для ўсіх катэгорый грамадзян.

Летась на Мазыршчыне пабудавалі амаль 66 тысяч квадратных метраў жылля. Былі ўведзены 173 аб'екты гандлю і 8 аб'ектаў грамадскага харчавання. Створана 51 новая арганізацыя, у тым ліку 18 у вытворчай сферы.

— Добрыя вынікі работы паказаў будаўнічы комплекс раёна, — працягвае старшыня райвыканкама. — Рост складае амаль 150 %. Мантажных работ, дарэчы, выканана на суму 405 мільёнаў рублёў.

**Арганізацыі раёна ў 2019 годзе вялі гандаль з 59 краінамі свету. Тавары пастаўляліся на рынкі 32 дзяржаў. Асноўныя экспартныя напрамкі — Расія, Украіна, Казахстан, Германія, Кітай, Літва, Латвія, Італія, Польшча. У 2020 годзе працягваецца замацаванне пазіцыі на новых рынках.**

На шэрагу прыярытэтных паказчыкаў развіцця раёна Алена Фёдараўна засяроджвае асобную ўвагу:

— За 2019 год працаўладкавана на новыя рабочыя месцы 426 чалавек. Рэалізацыя мер па забеспячэнні занятасці насельніцтва дазволіла паменшыць узровень беспрацоўя да 0,3 %. Сёлета плануецца працаўладкаваць каля 570 чалавек. Летась сярэднямесячная заработная плата ў Мазырскім раёне склала 1111,7 рубля. Ужо за шэсць месяцаў бягучага года яна вырасла да 1200,5.

Між тым за першае паўгоддзе 2020 года 258 грамадзян працаўладкавана на новыя рабочыя месцы. Створана 29 новых арганізацый, у тым ліку чатыры — у вытворчай сферы.

— За першае паўгоддзе сёлета ўведзена ў эксплуатацыю 16,524 тысячы квадратных метраў жылля, — адзначае кіраўнік раёна. Колькасць насельніцтва, занятага ў эканоміцы, — амаль 57 тысяч чалавек. Трэба адзначыць, што за студзень—чэрвень самыя высокія сярэднямесячныя заработныя платы ў раёне атрымалі работнікі будаўнічай галіны, сельскай і лясной гаспадарак. У будаўніцтве гэта 1358,2 рубля, у сельскай і лясной гаспадарках — 1182,5 рубля, у прамысловасці (без уліку ААТ «Мазырскі НПЗ») — 1113,5 рубля, у гандлі — 826,8 рубля.

Добрыя вынікі работы Мазырскага раёна ў прамысловасці. За шэсць месяцаў бягучага года гэты паказчык склаў 105,8 % да ўзроўню мінулага года, у сельскай гаспадарцы — 104,1 %.

Выручка ад рэалізацыі прадукцыі, тавараў і паслуг за пяць месяцаў бягучага года — на адметцы 2,861 мільярда рублёў, што складае 61 %. Выручка на аднаго работніка — 122,7 тысячы рублёў. Самы высокі гэты паказчык у сельскай і лясной гаспадарках. Да таго ж па выніках работы за мінулы год сельскагаспадарчымі арганізацыямі Мазырскага раёна тэмп росту вытворчасці валавай прадукцыі выкананы на 107,3 %.

**Наталля КАПРЫЛЕНКА.**

### ЗА ШЭСЦЬ МЕСЯЦАЎ 2020 ГОДА:

✓ вытворчасць сельгаспрадукцыі раёна — 52,9 мільёна рублёў;

✓ рознічны гандлеабарот — 309,2 мільёна рублёў.

### ЗА СТУДЗЕНЬ—МАЙ 2020 ГОДА:

✓ экспарт тавараў (без уліку нафты) — 25,5 мільёна долараў ЗША, або 87,9 % ад плана;

✓ экспарт паслуг — 19,1 мільёна долараў ЗША, або 68,1 % ад запланаванага.

# НАШ ПАЛЕСКІ ДЗЮ САЛЕЙ

## Мазырскі цыркавы калектыў «Арэна» — брэнд Беларусі

Цэнтр цыркавога мастацтва «Арэна» ў Мазыры — адзіная ў сваім родзе спецыялізаваная клубная ўстанова ў нашай краіне. У 2006 годзе прафесійныя артысты цырка, сужэнцы **Барыс і Марыя КУЗНЯЦОВЫ**, адкрылі ў горадзе на беразе Прыпяці студыю навучання дзяцей цыркавому мастацтву, такім чынам фактычна заклалі падмурак гісторыі беларускага дзіцячага цырка іператварылі куток Палесся ў «месца сілы» пачынаючых артыстаў гэтага жанру. Сёння заслужаны аматарскі калектыў Рэспублікі Беларусь «Арэна» — брэнд не толькі Мазыра, Гомельшчыны, але і ўсёй Беларусі.

Мастацкі кіраўнік калектыву Марыя Мікалаеўна родам з Мазыра. Рэжысёр-пастаноўшчык «Арэны» Барыс Рыгоравіч нарадзіўся і вырас ва Украіне, у Данецкай вобласці. Абое ў свой час выступалі ў Нацыянальным цырку на радзіме Барыса Кузняцова, разам аб'ездзілі паўсвета. Доўгі час цыркавое сямейства жыло і працавала ў Амерыцы. Але даўняя мара Кузняцовых — стварыць дзіцячую цыркавую студыю — ажыццявілася менавіта на Гомельскім Палессі.

## «Цыркавыя» — больш чым прафесія

Дзень за днём у Мазыры, у будынку былога Дома культуры на вуліцы Інтэрнацыянальнай, нават не кіпіць — бурліць сапраўднае артыстычнае жыццё. Тут нараджаюцца і адточваюцца цыркавыя нумары.






Выхаванка студыі цыркавога мастацтва «Арэна» Вікторыя УЛАСАВА.

Фота Таццяны ТКАЧОВАЙ.

— У нас займаецца каля сотні дзяцей, рэпетыцыі праходзяць штодня ў дзве змены. Работа з дзецьмі асабліва адказная, — тлумачыць Барыс Кузняцоў.

Адмысловага адбору ў «цыркавыя» тут не робяць. Галоўнае патрабаванне — жаданне вучыцца і працаваць.

Удзельнікі калектыву — дзеці і моладзь ва ўзросце ад 6 да 20 гадоў. У рэпертуары юных цыркавых артыстаў некалькі дзясяткаў разнажанравых нумароў. Палітра вельмі шырокая: акрабатыка, паветраная гімнастыка, арыгінальны жанр, эквілібрыстыка, жангляванне, клаўнада...

Назіраючы за трэніроўкамі на сцэне і ацэньваючы нумары падчас выступленняў, многія дзівяцца і не могуць уявіць, што такія неверагодныя трукі выконваюць не дарослыя прафесійныя артысты, а дзеці. Але ж гэта рэальнасць. Гэта яны, мазырскія хлопцы і дзяўчаты, скарылі фэсты цыркавога мастацтва ў Італіі, Кітаі, Расіі, Украіне, Казахстане, Ізраілі, Літве, Латвіі...

— Фэст у Монтэ-Карла — найвышэйшая планка для любога цыркавога артыста. Як Алімпіяда для спартсменаў. Мы шмат гадоў імкнуліся туды трапіць, зацята працавалі, каб мара нарэшце спраўдзілася, — апавядае мастацкі кіраўнік «Арэны» Марыя Кузняцова.

У кампліментах нашым паветраным гімнастам з Мазыра рассыпалася сама прынцэса Манака — Стэфанія. У 2017 годзе па выніках V Міжнароднага юнацкага цыркавога фэсту «Новае пакаленне» ў Монтэ-Карла мазыране скарылі тры адмысловыя прызы, што адбылося ўпершыню ў цыркавой гісторыі Беларусі. А Барыс Кузняцоў стаў пераможцам конкурсу «Чалавек года ў сферы культуры» ў намінацыі «Цыркавое мастацтва».

Праз год у Монтэ-Карла мазыране другі раз пацвердзілі сваю перамогу, а на міжнародным юнацкім фэсце цыркавога мастацтва European Youth Circus у Германіі былі ўдастоены бронзавага медаля. Пасля ў горадзе Ухань (Кітайская Народная Рэспубліка) на найпрэстыжнейшым Міжнародным фэсце акрабатычнага мастацтва выхаванец Кузняцовых эквілібрыст Максім Бабёр таксама атрымаў «бронзу». У сваім нумары мазыранін выкарыстоўваў восем шпулек, віртуозна балансаваў і ўтрымліваў раўнавагу.

«Арэна» пад кіраўніцтвам Марыі Кузняцовай годна прадстаўляла сваю краіну на шэрагу іншых міжнародных конкурсаў. Сярод іх — Еўрапейскі маладзёжны цыркавы фестываль-конкурс у Вісбадэне.

Адна са знакавых перамог у скарбонцы цыркавых артыстаў з Мазыра — гран-пры Міжнароднага фэсту CIRCUBA 2017 (Куба, 2017 год).

У 2018 годзе мастацкі кіраўнік «Арэны» Марыя Кузняцова была абрана пераможцай конкурсу «Чалавек года ў сферы культуры» ў намінацыі «Цыркавое мастацтва».

За шматгадовую і плённую працу, значны асабісты ўнёсак у развіццё цыркавога мастацтва, высокія дасягненні ў прафесійнай дзейнасці Барыс і Марыя Кузняцовы ўзнагароджаны медалямі Францыска Скарыны, нагрудным знакам Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь.

Сёння ўстанова на чале з сям'ёй Кузняцовых — унікальная для Беларусі, бо развівае і папулярызуе каштоўнасці дзіцячага цыркавога мастацтва. За час існавання студыі яе выхаванцы заваявалі больш 60 узнагарод. Мазырскія цыркавыя — уладальнікі гран-пры, чэмпіёны, медалісты, дыпламанты, а таксама адрасаты адмысловых прызоў цыркавой сцэны.

Юныя мазырскія артысты мелі гонар стаць часткай выступлення славутай канадскай сям'і дзю Салей.

Марыя і Барыс Кузняцовы выхавалі больш за 20 лаўрэатаў міжнародных конкурсаў цыркавога мастацтва, 18 грандстыпендыятаў і лаўрэатаў спецыяльнага фонду Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь па падтрымцы таленавітай моладзі.

Між тым сёння традыцыі мазырскай цыркавой сям'і актыўна падтрымліваюць два новыя пакаленні Кузняцовых: сын і нявестка — сужэнцы Сяргей і Ганна Кузняцовы, маленькі ўнук Іларыён і пляменніца Ганна Марозава.

**Наталля КАПРЫЛЕНКА.**

# СТАЎКА НА ІНТЭЛЕКТ,

**Віталь ШЫЛАЎ — дырэктар ААТ «Беларускабель»: «Намаганні нашага калектыву па выпуску прадукцыі, якасці якой давяраюць як на ўнутраным, так і на знешнім рынку, ацэненыя высокай узнагародай. Прэмія ўрада — гонар для нас! Але гэта не падстава спыняцца на дасягнутым, бо ўдасканаленне якасці прадуктаў, якія вырабляюцца — бясконцы працэс, а ў сучасных эканамічных умовах яшчэ і ледзь не адзіны спосаб перамагчы ў канкурэнтнай барацьбе».**



## ААТ «Беларускабель» — уладальнік Прэміі ўрада за дасягненні ў галіне якасці па выніках 2019 года



**Пасля комплекснага працэсу валачэння з васьмiміліметровай меднай катанкі атрымліваюць медны дрот дыяметрам 0,1 мм. На асаблівасці вытворчага працэсу звяртае ўвагу намеснік начальніка вытворчага цэха Аляксандр НІКАЛАЕНКА.**

## ІНТЭЛЕКТ. ІНАВАЦЫІ. ІНВЕСТЫЦЫІ

Сёння **ААТ «Беларускабель»** — адзін з лідараў кабельнай галіны ў СНД. І гэта нягледзячы на тое, што беларуская кабельна-правадная прадукцыя вырабляецца галоўным чынам з імпартнай сыравіны. Мазырская вытворчасць даказвае: можна быць годным гульцом насуперак шматлікім неспрыяльным акалічнасцям рынку.

Быць наперадзе канкурэнтаў па шматлікіх пазіцыях дапамагаюць укараненне перадавых тэхналогій, работа высокапрадукцыйнага абсталявання, пастаяннае тэхнічнае пераўзбраенне, шматступенчаты кантроль якасці. Стаўка робіцца на інтэлект, інавацыі, інвестыцыі.

## АСАРТЫМЕНТ УРАЖВАЕ

Сёння ў асартыменце ААТ «Беларускабель» — больш за 120 узораў прадукцыі, больш за 27 тысяч маркапамераў вырабаў.

**Кабельная прадукцыя ААТ «Беларускабель» выкарыстоўваецца ў нафтаі газаздабываючай прамысловасці, нафтаперапрацоўцы, грамадзянскім будаўніцтве, машынабудаванні, электра- і радыётэхніцы, авіяцыі, чыгунцы, мантажнай рабоце.**

Вытворчы прадукт ААТ «Беларускабель» запатрабаваны ва ўсіх асноўных галінах народнай гаспадаркі Беларусі і краін СНД.

— Мы ахопліваем увесь комплекс кабеляў, якія выкарыстоўваюцца на тэрыторыі Беларусі, — адзначае **дырэктар ААТ «Беларускабель» Віталь ШЫЛАЎ.** — Штогод асвойваецца каля 10 найменняў прадуктаў. Большасць — экспартаарыентаваныя, імпартазамяшчальныя, інавацыйныя, не маюць аналагаў у Беларусі.

## СТАНДАРТ ЯКАСЦІ

На прадпрыемстве створана ўласная лабараторыя сертыфікацыі. Яна акрэдытавана на правядзенне практычна ўсіх магчымых выпрабаванняў кабельнай прадукцыі.

— Робім аналіз прадукцыі і для нашых партнёраў, калі ў гэтым ёсць патрэба, — працягвае Віталь Шылаў. — Мы пацвярджаем сістэму сертыфікатаў якасці на адпаведнасць патрабаванням новай версіі міжнароднага стандарту ISO 9001:2015 «Сістэма менеджменту якасці. Патрабаванні». (DEKRA Certification B.V. Германія).

У 2017 годзе прадпрыемства таксама паспяхова прайшло сертыфікацыю на адпаведнасць патрабаванням гэтага стандарту ў Нацыянальнай сістэме пацвярджэння адпаведнасці Рэспублікі Беларусь.



**Прадпрыемства ААТ «Беларускабель» (раней «Мазыркабель») было арганізавана ў Мазыры ў 1958 годзе. На ўзвышшы Прыпяці размясціліся карпусы завода. З моманту адкрыцця прадпрыемства лічылася адным з найлепшых у кабельнай галіне на прасторах былога Саюза, а пазней краін СНД.**

Вядзецца мэтанакіраваная работа па сертыфікацыі і дэкларыраванні кабельнай прадукцыі. Усяго прадпрыемствам атрымана 18 дэкларацый.

— Высокі стандарт якасці нашай прадукцыі — самы важкі аргумент для замацавання моцных дзелавых сувязяў, — адзначае кіраўнік прадпрыемства. — Вырабы ААТ «Беларускабель» запатрабаваны ў такіх вядомых ва ўсім свеце кампаній, як **«Газпрам», «Лукойл», «СІБУР Холдынг», «Беларуськалій», «Уралкалій», «Гродна Азот», БелАЭС, «Белтэлекам», Беларуская чыгунка, прадпрыемствы авіяцыйнай прамысловасці.**



Наталля ЦІМАШЭНКА, кантралёр кабельных вырабаў.

**Імкнёмся быць канкурэнтнымі па цане, але гарантуем самы высокі ўзровень якасці нашай прадукцыі.**

## КУПЛЯЙЦЕ БЕЛАРУСКАЕ!

Добрая маркетынгавая палітыка — залог поспеху ўсёй вытворчасці, упэўненыя на прадпрыемстве. Вывучэнне кан'юнктуры рынку, якім займаюцца спецыялісты ААТ «Беларускабель», дазваляе ўвесь час пашыраць наменклатуру прадукцыі: яны сочаць, на што рэагуе рынак, што і па якой цане можна прадаць. Пад гэтыя патрабаванні распрацоўваюцца самыя розныя кабельныя вырабы, якія потым асвойваюцца і выпускаюцца на вытворчасці, робіцца неабходныя заяўкі на набыццё пэўнага абсталявання.

— Сродкі спажыўца павінны застацца ў нас, таму мы пастаянна развіваемся. Нашы канкурэнты — у асноўным расіяне, хоць ёсць і айчынныя. Толькі ў Мазыры чатыры заводы вырабляюць кабельную прадукцыю. Сёння існуе дастаткова прыватных кабельных заводаў, так што канкурэнцыя ў нас вельмі жорсткая, — зазначае Віталь Шылаў.



Валачыльшчык, Аляксей СТОРАЖ, працягвае дрот.

Між тым на рынку цяпер усё часцей выпускаецца кабельная прадукцыя з заніжанымі якаснымі паказчыкамі, для якіх выкарыстоўваецца сыравіна нізкай якасці.

— У супрацоўніцтве з Асацыяцыяй «Белкабель» мы займаемся маніторынгам рынку: праводзім кантрольныя закупкі, выяўляем нядобрасумленных прадаўцоў, якія прывозяць на тэрыторыю Беларусі кабель неналежнай якасці. Некаторыя тавары прадаюць у тым ліку пад маркай нашага прадпрыемства, — тлумачыць дырэктар ААТ «Беларускабель». — Такім чынам змагаемся не толькі супраць кантрафакту, але і з няякаснай прадукцыяй.

ААТ «Беларускабель» прыкладае ўсе намаганні, каб працаваць над паляпшэннем характарыстык кабельных вырабаў, асабліва ў дачыненні да пажарнай бяспекі. Шмат у чым гэтая магчыма дзякуючы добраму абсталяванню, а таксама тэхналогіям, якія істотна паляпшаюць фізіка-механічныя ўласцівасці вырабаў.

## ВЫРАТОЎВАЮЦЬ ЖЫЦЦІ

На прадпрыемстве ААТ «Беларускабель» выпускаецца агняўстойлівы кабель, які адпавядае ўсім міжнародным стандартам. Ён захоўвае ўсе неабходныя ўласцівасці і характарыстыкі ва ўмовах уздзеяння адкрытага полымя. Машыны абмотваюць спецыяльнай слюдой кожную жылу кабеля, якая праводзіць ток. Менавіта такая апрацоўка

# ІНАВАЦЫІ, ІНВЕСТЫЦЫІ

**Прадпрыемства выпрабляе мантажныя правады, тэрмарадыяцыйнаўстойлівыя правады, малагабарытныя і цеплаўстойлівыя правады, сілавыя і кантрольныя кабелі, кабелі сувязі, радыёчастотныя кабелі, а таксама кабелі і правады рознага спецыяльнага прызначэння з жылай з меднага ды алюмініевага дроту.**






дазваляе захаваць пры такіх тэмпературах функцыянальнае прызначэнне кабеля.

Кабелі захоўваюць сваю працаздольнасць ва ўмовах пажару на працягу не менш чым 180 хвілін. Гэта вельмі важна, калі, напрыклад, на ніжніх паверхах будынка адбыўся пажар, і ўсё вакол палае. У гэты час выключаюцца падача вады, асвятленне, ліфты. Людзі з верхніх паверхаў не могуць эвакуіравацца. Агнеўстойлівае выкананне кабельных вырабаў дазваляе прадухіліць няшчасныя выпадкі, дае магчымасць эвакуіраваць людзей і пры гэтым на працягу неабходнага часу падтрымліваць функцыі пажаратушэння.

## АДЗІНЫ Ў БЕЛАРУСІ!

— У вытворчым працэсе на нашым прадпрыемстве з савецкіх часоў выкарыстоўваецца паскаральнік зараджаных часціц, электронаў. Такімі спецыялізаванымі ўстаноўкамі ў СНД валодаюць усяго пяць вытворцаў. Наш паскаральнік — адзіны ў Беларусі, — уводзіць у курс справы **намеснік дырэктара па развіцці ААТ «Беларускабель» Дзмітрый ФІРАНЧУК.** — Паскаральнік электронаў выкарыстоўваецца для апрамянення ізаляцыі правадоў.

— Тэмпература эксплуатацыі такіх кабеляў складае ад мінус 60 да плюс 220 градусаў. І наша прадпрыемства — манапаліст па гэтай тэхналогіі на тэрыторыі Беларусі, — падкрэслівае суразмоўнік.

Наяўнасць прамысловага паскаральніка дазваляе ААТ «Беларускабель» забяспечыць патрэбы авіяцыйнай прамысловасці і надзейна замацавацца ў гэтым сегменце. Прадукцыя мазыран выкарыстоўваецца ў авіябудаўніцтве, ідзе па дзяржзаказе на патрэбы ваенна-прамысловага комплексу Беларусі. Праз дылерскую сетку ёсць магчымасць пастаўляць яе прадукцыю для патрэб распрацоўшчыка авіяцыйнай тэхнікі «Тупалеў» у Расійскай Федэрацыі.

Выдатна сябе зарэкамендавалі як на знешнім, так і на ўнутраным рынках вырабы з безгалагенавай ізаляцыяй і абалонкай — у галіне пажарнай бяспекі яны незаменныя.

На ААТ «Беларускабель» дыслакуецца тэхнічная прыёмка № 43 АТ «РТ-Тэхпрыёмка» спецыялізаваная арганізацыя дзяржкарпарацыі «Растэх» па ацэнцы адпаведнасці прадукцыі ў форме кантролю якасці і тэхнічнай прыёмкі, згодна з Палажэннем ад 22 кастрычніка 2007 года «Аб парадку правядзення кантролю якасці матэрыялаў і паўфабрыкатаў, якія выкарыстоўваюцца ў вытворчасці ўзбраення, ваеннай, авіяцыйнай і спецыяльнай тэхнікі».

## ПРАДУКЦЫЯ ДЛЯ АЭС

ААТ «Беларускабель» — адзіны на тэрыторыі Беларусі дзяржаўны вытворца ў галіне кабельнай прадукцыі, які атрымаў права пастаўляць свае вырабы на БелАЭС. Мазырскае прадпрыемства атрымала акрэдытацыю пры дазволе расійскага дзяржаўнага холдынга «Расатам» у навукова-даследчым інстытуце ў Маскве.

## МАДЭРНІЗАЦЫЯ ВЫТВОРЧАСЦІ

На прадпрыемстве праведзена мадэрнізацыя існуючага абсталявання сілавых кабеляў. Яны ідуць на грамадзянскае будаўніцтва. Цяпер зроблены акцэнт на зніжэнне матэрыялаёмістасці і энергазберажэнне.


**Раман ПАРТНОЎ, наладчык паскаральнікаў зараджаных часціц, сочыць за апрамяненнем кабельнай прадукцыі.**

На прадпрыемстве рэалізуецца праграма вытворчасці лічбавых кабеляў для перадачы даных. Гэты від прадукцыі выкарыстоўваецца для правядзення ў дамы інтэрнэту і лічбавага тэлебачання.

Працуюць новыя тандэмныя лініі, якія дазваляюць выконваць адначасова тры тэхналагічныя працэсы. Калі раней валачэнне, абпал і накладанне ізаляцыі праводзіліся асобна, і на кожным працэсе працавалі асобныя рабочыя, то новыя сучасныя тэхналогіі дазваляюць аб'яднаць гэтыя тры працэсы ў адзін. Зразумела, павышаецца хуткасць выканання работы, зніжаецца сабекошт вырабаў і павышаецца іх канкурэнтаздольнасць.



**Дзмітрый ФІРАНЧУК, намеснік дырэктара па развіцці.**

Асобна развіваецца вытворчасць апрэсаваных вілак для складаных бытавых прыбораў. Новае абсталяванне дазваляе аптымізаваць і аўтаматызаваць цяжкую ручную працу і, зноў жа, павялічыць прадукцыйнасць. Абноўлены шэраг выпрабавальнага абсталявання. Усё гэта спрыяе максімальна эфектыўнай рабоце на кожным працэсе вытворчасці.

## АМБІЦЫЙНЫЯ ПЛАНЫ

На ААТ «Беларускабель» распрацавана праграма развіцця прадпрыемства да 2030 года. Амбіцыйныя планы прадугледжваюць і ёмістыя інвестыцыі. Стратэгічныя задачы на сёння — павышэнне канкурэнтаздольнасці прадукцыі за кошт зніжэння выдаткаў, павелічэнне прадукцыйнасці, сталы кантроль прадукцыі, набыццё новага абсталявання і правільная матывацыя работнікаў усіх структурных падраздзяленняў.

Адна з навінак, якія асвойваюць сёння, — сілавыя кабелі кантрольныя ўсталявальныя з жылай з алюмініевага сплаву. Гэтая інавацыя арыентавана на грамадзянскае будаўніцтва. Добрую якасць кабельнага прадукту ацэняць як айчынныя, так і замежныя кампаніі, упэўнены на прадпрыемстве.

— Яшчэ адзін важны маржынальны кірунак — чыгунка: тэхнолагі працягваюць развіваць сігнальна-блакавальныя кабелі з гнуткай жылай, — адзначае дырэктар ААТ «Беларускабель». — Асвоілі выпуск спецыялізаванага кабелю для станцыі зарадкі акумулятараў аўтамабіляў. Прапрацоўваецца і шэраг іншых перспектыўных праектаў. Ёсць што прапанаваць інжынерам авіяцыйнай і ваеннай прамысловасці.

Па-ранейшаму прывабныя для мазырскага вытворцы і суднавыя кабелі з ізаляцыяй з апрамененага поліэтылену. У Беларусі гэта вольная ніша. За выпуск такой прадукцыі ніхто з айчынных вытворцаў больш не бярэцца з-за адсутнасці тэхнічных магчымасцяў. На прадпрыемстве распрацаваны таксама інвестпраект па выпуску кабеляў буйнога сячэння.

Інавацыйная работа прыносіць плённыя эканамічныя вынікі.

## САЦЫЯЛЬНЫ ПРАЕКТ

Сёння ААТ «Беларускабель» задавальняе ўсе патрэбы айчыннага рынку па сеткавых шнурах для складаных бытавых электрапрыбораў. Штомесяц вырабляюць 200 тысяч адзінак. План па вытворчасці гэтага прадукту, дадзены Міністэрствам прамысловасці Беларусі на год, — 1 мільён 800 тысяч адзінак.

Нягледзячы на тое, што для мазырскага прадпрыемства сеткавыя шнуры не асноўная вытворчасць, яна захоўваецца і развіваецца. Гэта вельмі важны сацыяльны праект. Такім чынам ААТ «Беларускабель» гарантуе рабочыя месцы амаль для паўсотні работнікаў — жанчын сярэдняга ўзросту, спецыфічная рабочая спецыяльнасць якіх не дазволіць знайсці новы занятак на тэрыторыі раённага цэнтра.

## КІРУНАК НА ЭКСПАРТ

Сёння прадукцыя прадпрыемства рэалізуецца ў больш чым 15 краін. Асноўныя, больш аб'ёмныя пастаўкі ідуць у Расійскую Федэрацыю. Але актыўна пашыраюцца пастаўкі ва Украіну, краіны Прыбалтыкі. Асвойваюцца рынкі Грузіі, Чэхіі, Вялікабрытаніі.

— Наш курс — на дыверсіфікацыю экспарту, пошук партнёраў у далёкім замежжы, — расказвае кіраўнік ААТ «Беларускабель». — Мы шукаем магчымасці ахапіць нашай вытворчасцю не толькі краіны Прыбалтыкі і, як кажуць, бліжэйшай дугі.

Прапрацоўваецца лагістыка для экспарту: гэта марскі шлях і перавозкі чыгуначным транспартам.

— Не так даўно, напрыклад, адбыліся адгрузкі нашага прадукту ў Туркменістан. Акрамя таго, Узбекістан, Казахстан, Арменія, Грузія сёння таксама арыентуюцца менавіта на кабельную прадукцыю беларускай вытворчасці, — дадае Віталь Шылаў.


**Ала ПРАДЗЬКО, старшы майстар участка скруткі.**


**Яўген РУДОЙ, апрасоўшчык кабеляў і правадоў пластыкатамі і гумай.**

**Матэрыялы падрыхтавалі Наталля КАПРЫЛЕНКА, Алена ДАЎЖАНОК.**
**Фота Таццяны ТКАЧОВАЙ.**

УНП 400083186.

# ПА ЗДАРОВАЕ СЭРЦА — У МАЗЫР

## Міжраённы кардыялагічны цэнтр у Мазыры аказвае спецыялізаваную медыцынскую дапамогу насельніцтву ўсяго Палескага рэгіёна

Акрыццё ўлетку мінулага года кардыяцэнтра ў Мазыры стала сапраўды знакавай падзеяй для ўсёй медыцыны гэтага рэгіёна Гомельшчыны. Новую ўстанову з сучасным абсталяваннем і падрыхтаваным штатам спецыялістаў мясцовыя жыхары чакалі з нецярпеннем.

Міжраённы кардыяцэнтр створаны на базе Мазырскай цэнтральнай гарадской бальніцы. У зоне яго абслугоўвання, апрача Мазырскага, Нараўлянскі, Калінкавіцкі, Лельчыцкі, Жыткавіцкі, Петрыкаўскі, Ельскі і Хойніцкі раёны. Гэта каля 300 тысяч чалавек, якім неабходна дапамога спецыялістаў у лячэнні і прафілактыцы сардэчна-сасудзістых захворванняў. Работа кардыялагічнага цэнтра арганізавана па прынцыпе калектыўнага карыстання.

На падрыхтоўку памяшканняў і набыццё абсталявання для новай установы было накіравана каля трох мільёнаў рублёў. Фінансаванне ажыццяўлялася як з абласнога, так і з рэспубліканскага бюджэту. Для работы ў цэнтры чатыры спецыялісты эндаваскулярнай хірургіі прайшлі перападрыхтоўку на базе Беларускай медыцынскай акадэміі паслядыпломнай адукацыі.

Кардыяцэнтр аснашчаны сучасным ангіяграфічным комплексам, усталяваным у рэнтген-аперацыйнай. Мазыр стаў першым райцэнтрам Гомельскай вобласці, дзе з'явілася падобнае медыцынскае абсталяванне.

— Ангіяграфічны комплекс дазваляе выяўляць любыя праблемы з артэрыяльным рэчышчам сасудаў. Пры гэтым умяшанне ў арганізм чалавека ажыццяўляецца без разрэзаў, што дазваляе пазбегнуць пасляаперацыйных траўмаў. У першую чаргу мы можам больш якасна лячыць інфаркты міякарда, паляпшаючы далейшы прагноз і якасць жыцця пацыентаў, — адзначыла **галоўны ўрач Мазырскай цэнтральнай гарадской паліклінікі Наталля ЦІШКОВА.**



**Наталля ЦІШКОВА, галоўны ўрач УА «Мазырская цэнтральная гарадская паліклініка».**



**За работай рэнтгенэндаваскулярныя хірургі Андрэй ЧЫЛЕЙ і Артур ДАРОНІН.**



**Рэнтгенаперацыйная з ангіяграфічным комплексам Innova IGS540.**

У кардыяцэнтры праводзяць як планавыя, так і экстранныя аперацыі. Ніякіх абмежаванняў па колькасці пацыентаў няма. Медыкі адзначаюць, што ёсць магчымасць аказваць дапамогу ўсім, хто мае ў гэтым патрэбу. У аддзяленні таксама праводзіцца арганізацыйна-метадычная і прафілактычная работа з урачамі і пацыентамі з замацаваных раёнаў.

— Адна з галоўных задач установы — павялічыць даступнасць спецыялізаванай кардыялагічнай дапамогі для жыхароў Палескага рэгіёна, — дадала галоўны ўрач. — Чым часцей і эфектыўней захворванні будуць выяўляцца на ранняй стадыі, тым больш шанцаў на паспяховы вынік лячэння.

Мазырскія спецыялісты на месцы цяпер маюць магчымасць займацца высакаякаснай дыягностыкай і лячэннем сасудаў сэрца: праводзіць каранаграфію і стэнтаванне.

# МУЗЕЙ ЖАНЧЫН МАЗЫРШЧЫНЫ — УНІКАЛЬНЫ ІНТЭРАКТЫЎНЫ ПРАЕКТ

Ад героя Вялікай Айчыннай вайны да лідараў сённяшняга часу: музей, створаны на базе сярэдняй школы № 11 Мазыра, расказвае пра 30 выдатных жанчын. Сярод іх — Героі Савецкага Саюза, падпольшчыцы, урачы, маці воінаў-інтэрнацыяналістаў, кіраўнікі, грамадскія актывісты, дэпутаты Палаты Прадстаўнікоў і члены Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу, спартсмены, дзеячы культуры і мастацтва. У кожнай — свая біяграфія, свае заслугі, але ўсіх іх аб'ядноўвае любоў да роднага краю.

— На тое, каб сабраць матэрыялы, спатрэбілася каля двух гадоў, — тлумачыць **дырэктар СШ № 11 Мазыра Яўгенія ВАРАНОВІЧ.** — Адкрыццю папярэднічала карпатлівая работа: асабістыя сустрэчы з гераінямі, збор унікальных разнапланавых экспанатаў. Збіралі і лісты з фронту, і ордэны, і медалі, і граматы, і пасведчанні. Рыхтавалі матэрыялы настаўнікі і дзеці. Праводзіліся цэлыя журналісцкія расследаванні.

Ганаровае месца ў экспазіцыі заняла і гісторыя жанчыны-кіраўніка, якая ўзначальвае Мазырскі райвыканкам, — Алены Паўлечкі. Падчас экскурсіі звяртаецца ўвага на тое, што на Мазыршчыне больш за 60 працэнтаў кіруючых пасад займаюць прадстаўніцы прыгожага і далёка не слабага полу. Жанчына даказала, упэўнівае гэты незвычайны праект, што можна быць далікатнай і мяккай жонкай, клапатлівай маці і ў той жа час прынцыповым кіраўніком, прафесіяналам сваёй справы, здольным на рашучыя ўчынкі.

Ідэя стварэння музея жанчын Мазыршчыны належыць раённай арганізацыі Беларускага саюза жанчын. Цяпер тут больш за 1100 экспанатаў. Не ўсе яны прадстаўлены на стэндах. Памяшканне параўнальна невялікае, але музей аснашчаны паводле найноўшых тэхналогій. Інфармацыю можна паглядзець на інтэрактыўным экране.

Экскурсіі праводзяць педагогі і вучні. Віртуальную ж экскурсію па музеі жанчын Мазыршчыны можна здзейсніць на сайце сярэдняй школы № 11. На цяперашні момант у межах праекта вядзецца актыўная работа па пошуку новых гераінь. Працягваецца даследчая справа вучняў і настаўнікаў у гэтым кірунку.

Між тым ёсць на што паглядзець і чаму павучыцца ў рабоце іншых устаноў адукацыі Мазырскага раёна.

— Напрыклад, у Каменскай сярэдняй школе паспяхова рэалізуецца праект «Каменская эка-дача», — засяроджвае ўвагу **начальнік аддзела адукацыі Мазырскага райвыканкама Любоў КЛЕПЧУКОВА.** — Дзеці з вялікай цікавасцю вучацца вырошчваць экалагічна чыстую прадукцыю і гатаваць смачныя смузі, духмяныя прыправы і карысную гарбату.

У Прудкоўскай сярэдняй школе сіламі педагогаў распрацавана аўтарская праграма па фарміраванні ў вучняў асноў аграэканамічнай культуры. Галоўная ідэя — матывацыя ў выбары прафесій, якая будзе запатрабавана ў аграпрамысловым комплексе рэгіёна.



**Намеснік дырэктара СШ № 11 г. Мазыра Ірына СЯРНОВА прэзентуе віртуальную экскурсію па музеі жанчын Мазыршчыны.**



**Дырэктар Яўгенія ВАРАНОВІЧ і начальнік аддзела адукацыі Мазырскага райвыканкама Любоў КЛЕПЧУКОВА ў музеі жанчын Мазыршчыны.**



**На зборы ўраджаю вучні ДУА «Асавецкая сярэдняя школа — дзіцячы сад».**

Хлопцы і дзяўчаты спасцігаюць асновы садаводства і агароднiцтва. У якасці базы для нестандартнай формы работы — школьны ўчастак, на якім вырошчваюць агародніну і садавіну.

— Дарэчы, у мінулым сезоне атрымалі з участка 400 кілаграмаў бульбы, — тлумачыць Любоў Сцяпанаўна. — Такі добры вынік не толькі даў вучням магчымасць зразумець, як добрая гаспадарка дапамагае скараціць выдаткі на харчаванне, але і натхніў іх на новыя сельгасвыпрабаванні.

У цэлым жа новая форма работы Прудкоўскай сярэдняй школы заклікана выхоўваць у вучняў павагу і любоў да работы на зямлі. У школе дзейнічае сельгасатрад «АграСіла». Школьнікі распрацавалі бізнес-план па стварэнні фруктова-ягаднага гадавальніка. Дарэчы, сёлета для ўмацавання матэрыяльна-тэхнічнай базы Прудкоўскай школе ад Мазырскага райвыканкама быў падораны сертыфікат на дзве тысячы рублёў.

Менавіта ўстановы адукацыі адыгрываюць вялікую ролю ў развіцці аграрнай галіны праз папулярызацыю сельскагаспадарчай работы. У гэтым упэўнена начальнік аддзела адукацыі Мазырскага райвыканкама. Любоў Клепчукова звяртае ўвагу і на тое, што ўстановы адукацыі Мазыршчыны прыкладаюць усе намаганні, каб іх выпускнікі пасля далейшай вучобы вярталіся працаваць у свае родныя населеныя пункты.

— З пастаўленай задачай паспяхова спраўляецца Руднянская сярэдняя школа, — адзначае Любоў Сцяпанаўна. — Больш за 50 % выпускнікоў гэтай установы адукацыі выбіраюць сельскагаспадарчыя спецыяльнасці, пасля чаго вяртаюцца ў аграгарадок дыпламаванымі спецыялістамі.

Трэба адзначыць, што летась у Мазырскім раёне выпускнікам школ было выдадзена 217 мэтавых накіраванняў. Сёлета — ужо 260, а гэта значыць, што хлопцы і дзяўчаты вернуцца дыпламаванымі спецыялістамі — жыць, працаваць, стварыць уласныя сем'і будуць на роднай Мазыршчыне.

**Наталля КАПРЫЛЕНКА.**
**Фота Тацяны ТКАЧОВАЙ і з архіваў арганізацый.**

УНП 400036117.

Краіна здароўя

Вядучая рубрыкі Алена КРАВЕЦ.
Тэл. (017) 287-18-36.

Скажыце, доктар...

# СІНДРОМ ХРАНІЧНАЙ СТОМЛЕНАСЦІ

## У чым яго прычына і да каго звяртацца

**Стомленасць, якую многія людзі адчуваюць у канцы напружанага рабочага дня, з'яўляецца абсалютна нармальным станам. А вось працяглае агульнае недамаганне і павышаная стамляльнасць з'яўляюцца прыкметамі розных хвароб і станаў. Што дапамога справіцца з праблемай — некалькі гадзін ці дзён адпачынку ці ўсё ж візіт да доктара? Разабрацца ў гэтым дапамагла ўрач-гігіеніст Мінскага абласнога цэнтра гігіены, эпідэміялогіі і грамадскага здароўя Алена СМІРНОВА.**

— Прычыны стомленасці могуць быць як фізічныя, так і псіхалагічныя. У першым выпадку ўзнікае часовая нездольнасць мышц падтрымліваць аптымальную фізічную нагрузку, і чым больш нагрузкі, тым больш яна выражана, — тлумачыць урач. — Разумовая стомленасць праяўляецца ў зніжэнні пазнавальнай здольнасці, прыкметамі якой з'яўляюцца санлівасць і зніжэнне канцэнтрацыі ўвагі. Калі пасля адпачынку ўсё гэта праходзіць, то гэта фізічная стомленасць. Паталагічная стомленасць (астэнія) наадварот не залежыць ад аб'ёму нагрузак і захоўваецца доўгі час.

Існуе некалькі прычын паталагічнай стомленасці.

**Няхватка вітамінаў і жыццёва неабходных элементаў.** Размова перш за ўсё пра вітаміны катэгорыі B, C, D, калій, жалеза, магній, ёд.

**Што рабіць:** магчыма, давядзецца перагледзець свае харчовыя звычкі і дадаць у рацыён рыбныя, мясныя прадукты, субпрадукты, яйкі, натуральныя малочныя прадукты, зялёналістую гародніну, арэхі і семкі, а таксама завесці звычку прымаць сонечныя ванны.

Дарэчы, выкананне рэжыму працы і адпачынку, паўнавартаснае харчаванне і сон дапамагаюць пазбегнуць пераядання ці недаядання, дазваляюць не злоўжываць кафеінам і ў выніку з'яўляюцца прафілактыкай стомленасці.

**Дыябет.** Пры гэтым захворванні ўзровень цукру ў крыві рэзка павышаецца, а глюкоза, якая адказвае за забеспячэнне чалавека энергіяй, літаральна прападае ўпустую. У выніку есці хочацца больш, а сіл пры гэтым атрымліваецца менш. Арганізм дыябетыкаў патрабуе больш вадкасці, у тым ліку і ўначы, таму іх сон перарывісты і непаўнацэнны.

**Што рабіць:** мінімізаваць ужыванне прадуктаў, якія ўтрымліваюць рафінаваны цукар і муку вышэйшага гатунку, звярнуцца да доктара дзеля атрымання рэкамендацый і прызначэння лячэння.

**Дэпрэсія.** Пры дэпрэсіўных станах апатыя і агульная слабасць з'яўляюцца аднымі з прыкмет хваробы.

**Што рабіць:** калі вы разумееце, што гэты стан доўжыцца дастаткова працяглы перыяд, шкодзіць вашай прафесійнай дзейнасці і ўзаемаадносінам з блізкімі, неабходна звярнуцца да ўрача па лячэнне.

**Шчытападобная залоза.** Гарманальныя парушэнні з боку шчытападобнай залозы, якія могуць праяўляцца як адсутнасць сіл пры паніжанай функцыі (гіпатырэёз) і залішняй стамляльнасці пры павышанай функцыі (гіпертырэёз).

**Што рабіць:** звярнуцца да эндакрынолага для накіравання на абследаванне і прызначэння лячэння.

**Анемія.** Яна можа выклікаць павышаную стамляльнасць, бо пры анеміі ў крыві зніжаецца колькасць эрытрацытаў, што вядзе да павінянага забеспячэння клетак цела кіслародам. Анемію звычайна звязваюць з недахопам жалеза, а таксама з недастатковым ужываннем вітаміну B12 і фоліевай кіслаты.

**Што рабіць:** звярнуцца да ўрача для атрымання рэкамендацый і пры неабходнасці — назначэння лячэння. А таксама адкарэктаваць свой рацыён, уключыўшы прадукты, якія ўтрымліваюць жалеза, вітамін B12 і фоліевую кіслату.

**Маларухомы спосаб жыцця** вядзе да адчування слабасці і болю ў целе ў сувязі з доўгім знаходжаннем у ненатуральнай позе.

**Што рабіць:** рэгулярныя фізічныя практыкаванні садзейнічаюць паляпшэнню кровазвароту, насычэнню кіслародам усіх сістэм арганізма, дасягненню балансу ў гармонах, садзейнічаюць вызваленню эндарфінаў, павялічваюць вынослівасць, паляпшаюць настрой і дапамагаюць нармалізаваць сон.

**Няякасны сон** вядзе да адчування разбітасці, стомленасці, адсутнасці канцэнтрацыі.

**Што рабіць:** прытрымлівацца правільнага рэжыму дня. А менавіта спаць не менш за 7—9 гадзін, старацца класціся ў ложак і ўставаць у адзін і той жа час, не грэбаваць воднымі працэдурамі раніцай і ўвечары, практыкаваць вячэрнія прагулкі, займацца спортам. Не пашкодзіць і прыём заспакаяльных травяных настоеў і гарбаты.

# ЧЫМ ЗАПОМНЯЦЦА КАНІКУЛЫ?

## Траўмы, апёкі, атручванні... Як іх пазбегнуць?

**Рухомасць і дапытлівасць дзяцей, асабліва дашкольнага ўзросту, іх імкненне да пазнання наваколля настолькі вялікія, што яны стараюцца абсалютна ўсё ўбачыць, памацаць, паспрабаваць. Пара з каструлі ці чайніка, бліскучы электрычны прас, распаленая электраплітка або абагравальнік, электраразеткі, провад — іх прыцягвае ўсё. І менавіта з гэтымі прадметамі часта звязаны розныя непрыемныя здарэнні і нават няшчасныя выпадкі: раненні, хімічныя і тэрмічныя апёкі, атручванні лекамі і іншымі рэчывамі, паражэнне электратокам. Пра важныя правілы бяспекі нагадала ўрач-педыятр, загадчык 3-га педыятрычнага аддзялення 3-й гарадской дзіцячай клінічнай паліклінікі Мінска Людміла КІПЦЭВІЧ.**

Дзеці самі не могуць ацаніць пагрозу, якую тояць агонь, гарачыя вадкасці, хімічныя рэчывы, электрычнасць. Папярэдзіць бяду абавязаны дарослыя. Таму найперш прыбярыце ў недаступныя месцы нажніцы, пруткі, іголкі, нажы, відэльцы, папярэджвае доктар.

— Маленькія дзеці часцей за ўсё апякаюцца гарачым малаком, гарбатай, супам. Апёкі адкрытых участкаў цела, выкліканыя кіпенем, парай або каротакачасовым дакрананнем да гарачага прадмета, часцей за ўсё бываюць невялікімі па памерах і неглыбокімі. У такіх выпадках рэкамендуецца як мага хутчэй падставіць апечанае месца пад струмень халоднай вады і трымаць 10—15 хвілін, пакуль не зменшыцца боль. Таксама можна скарыстацца халоднымі прымочкамі. Для гэтага кавалак чыстай мяккай тканіны або марлі намачыце ў халоднай вадзе і прыкладзіце да пашкоджанага ўчастка. Па меры сагравання мяняйце прымочкі, — раіць Людміла Кіпцэвіч.

Цяпер у побыце шырока выкарыстоўваюцца розныя хімічныя рэчывы. Некаторыя з іх, трапіўшы на скуру дзіцяці, могуць выклікаць яе апёк. Асноўная задача пры хімічным апёку — як мага хутчэй змыць са скуры небяспечнае рэчыва.

— Не накрывайце абрусам стол і не пакідайце на ім прадметы. Дзеці любяць сцягваць абрус, і, падаючы, прадметы наносяць траўмы і апёкі, — нагадвае медык. — Не варта пакідаць дзіця адно. Зусім маленькія без нагляду падаюць з канапы, ложкаў і атрымліваюць удары, пераломы, якія могуць мець цяжкія наступствы.



Доўгае знаходжанне на сонцы нярэдка вядзе да ўзнікнення на адкрытых частках цела сонечных апёкаў. Пачырваненне скуры нярэдка суправаджаецца дрыжыкамі, павышэннем тэмпературы цела, галаўным болем. Асабліва праяўляецца гэта пры так званым сонечным ударзе, які развіваецца пры доўгім знаходжанні на сонцы з непакрытай галавой. Стан дзіцяці яшчэ больш пагаршаецца, калі далучаецца і цеплавы ўдар. Здараецца гэта пры агульным перагрэванні ў неадпаведнай умовам надвор'я вопратцы. У дзяцей узнікае не толькі галаўны боль, але і агульная слабасць, галавакружэнне, шум у вушах, млоснасць. У такім выпадку малога варта неадкладна перанесці ў цень ці прахалоднае памяшканне, наколькі магчыма распрануць, астатнюю вопратку расшпіліць альбо папырскаць халоднай вадой, пакласці на галаву дзіцяці халодны кампрэс і часта яго мяняць. Можна намачыць вопратку або загарнуць пацярпелага ў што-небудзь мокрае. Добра даць панюхаць ватку з нашатырным спіртам, падносячы яе да носа не бліжэй чым на 8—10 сантыметраў. Калі гэта не палепшыць стан, трэба выклікаць «хуткую».

— На жаль, не рэдкія ў дзіцячым узросце атручванні. Часцей яны сустракаюцца ў дзяцей дашкольнага ўзросту, якія цягнуць у рот усё, што трапіцца пад рукі. Вельмі небяспечныя атручванні бытавымі хімічнымі рэчывамі — ацэтонам, хларафосам, нафталінам, анілінавымі фарбавальнікамі, сродкамі для барацьбы з грызунамі, — папярэджвае ўрач. — У шэрагу выпадкаў, калі своечасова не аказана неадкладная дапамога, яны становяцца прычынай смерці дзіцяці.

Апошнім часам пачасціліся атручванні таблеткамі — яны часта маюць прыгожую ўпакоўку і прыцягваюць дзяцей. Лекі, якія выпускаюцца ў выглядзе каляровых дражэ, малыя і ўвогуле прымаюць за цукеркі, тым больш што абалонка іх звычайна салодкая. Атручванні лекамі вельмі небяспечныя. Яны могуць праяўляцца ўзрушанасцю або млявасцю, раптоўным надыходам глыбокага сну, парушэннем дыхання або сардэчнай дзейнасці. Калі даяце дзіцяці таблетку, яшчэ раз уважліва прачытайце этыкетку на ўпакоўцы. Лепш лішні раз праверыць і выключыць памылку, якая можа прывесці да цяжкіх наступстваў.

Надзвычай небяспечныя атручванні шчолачамі і кіслотамі. Пры іх адразу ж з'яўляецца рэзкі боль у роце, горле, страваводзе, ацёк слізістых абалонак вуснаў, паражэнні рота, гартані. Пры любым атручэнні неабходна неадкладна выклікаць «хуткую», а да яе прыбыцця як мага хутчэй выдаліць атрутнае рэчыва са страўніка. Для гэтага дзіцяці прапануюць выпіць некалькі шклянак цёплай вады і затым выклікаюць рвоту, раздражняючы заднюю сценку глоткі пальцам ці націскаючы лыжкай на корань языка. Пры атручванні кіслатой у ваду для яе нейтралізацыі варта дадаць соды (чайную лыжку на шклянку вады), пры атручванні шчолачамі (напрыклад, каўстычнай содай, мыйнымі сродкамі) — дадаць лімонны сок, кіслату ці воцат.

Маленькаму пацярпеламу неабходны ў такім выпадку доступ свежага паветра і паболей вадкасці — чай, супы. Да халодных ног можна пакласці цёплыя грэлкі. Далейшае лячэнне дзіцяці праводзіць урач.

— Бацькам важна захоўваць спакой і цвярозы розум. Важна даставіць у бальніцу разам з дзіцем рэшткі рэчываў у бутэлечках, слоічках ці іншых упакоўках, з якімі дзіця гуляла, якія брала ў рукі і, магчыма, прагліпнула, а таксама паспрабаваць вызначыць колькасць прынятага атрутнага сродку. А вось упадаць у паніку, кідацца ад аднаго ўрача да іншага, прыслухоўвацца да парад бабуль, знаёмых, суседзяў не трэба, — кажа ўрач.

# ЗАХОЎВАЕМ ПРАДУКТЫ ПРАВІЛЬНА

**Ці ведаеце вы, як правільна захоўваць прадукты пасля пакупкі? Чаму магазінная ўпакоўка сыру і каўбасы — не найлепшы варыянт для трымання ў нашым халадзільніку? З-за чаго чарнеюць бананы і гніюць агуркі?**

Хлеб, аказваецца, вялікі аматар холаду. Белы, калі яго планнуеца расцягнуць на чатыры-пяць дзён, рэкамендуецца адразу пасля пакупкі адправіць у асноўнае аддзяленне халадзільніка. Так, там ён крыху падсохне, але застанецца прыдатны да яды.

У маразільнай камеры хлеб пражыве яшчэ даўжэй — мінімум два месяцы. Трэба толькі нарэзаць і раскласці па кантэйнерах. Прычым пры вельмі нізкіх тэмпературах хлеб становіцца нават лепшы за свежы. Потым дастаткова разагрэць яго ў мікрахвалевай печы ці даць паляжаць пры хатняй тэмпературы.

Вельмі папулярная памылковая думка — што маразілка захоўвае прадукты доўга, але псуе іх смак, выбівае з іх пахі. Фрукты, ягады, рыба і мяса пры правільным падыходзе пасля некалькіх месяцаў у холадзе будуць не горш за свежыя. Ёсць толькі тры важныя правілы.

Па-першае, тэмпература ў маразільнай камеры павінна быць не менш за мінус 18 градусаў. Інакш вада, ператвараючыся ў лёд, а значыць, пашыраючыся, проста рве сценкі клетак прадуктаў.

Па-другое, нават замарожанае мяса не можа захоўвацца ў звычайным халадзільніку вечна. Тэрміны захоўвання хоць і падаўжаюцца, але варта пра іх памятаць.

І трэцяе — прадукты варта правільна размарожваць. Захацелі на вячэру мяса? За суткі да гэтага трэба перакласці яго з маразілкі ў асноўны халадзільнік, дзе плюс чатыры-шэсць градусаў. Гэта ідэальныя ўмовы для таго, каб мяса захавала сваю сакавітасць, пах і смак.

Арэхі пасля пакупкі таксама лепш перасыпаць у шкляны слоік ці кантэйнер з герметычнай крышкай і адразу паставіць у халадзільнік. Акрамя прахалоды, там цемра — найлепшы сябар арэхаў, якія на святле хутка акісляюцца і становяцца прагорклымі.

А вось сыр лепш дастаць з цэлафану, у якім ён звычайна і прадаецца, і перакласці ў пергаментную паперу, каб ён не пацеў і не выдзяляў вадкасць. Каўбасу таксама шкодна трымаць у поліэтыленавай упакоўцы. Ідэальна будзе закруціць яе ў пергамент — так прадукт даўжэй застанецца сочны.

Бананы будуць захоўвацца даўжэй, калі трымаць іх у ізаляцыі адзін ад аднаго: раздзяліць звязку, ножку кожнага банана заматаць плёнкай, пакласці бананы ў асобныя пакеты.

Спецыялісты раяць трымаць такую вадзяністую агародніну, як агуркі, не ў халадзільніку і абавязкова ў месцы, якая сама меней на два сантыметры запоўнена звычайнай вадой. Такі спосаб падыходзіць і для зяленіва, якое трэба ставіць у стакан з вадой, быццам бы кветкі ў вазу.

Свой погляд

## АДКУЛЬ МЫ РОДАМ?

**Беларусь — суверэнная дзяржава і, можа, нядрэнна, што ў ёй двухмоўе. Праўда, на практыцы выходзіць так, што родную мову, мову, на якой стагоддзямі гаварылі нашы продкі, пачуеш не часта.**

Невялікі прыклад. Сам я родам з вёскі Пірэвічы Жлобінскага раёна. Два гады таму пашчасціла: прыехаў на бацькаўшчыну, а там якраз свята вёскі. Трапіў на яго і даведаўся, колькі ж у мяне выдатных землякоў — хлебаробаў, рабочых, вучоных, генералаў!..

А далей — пачаўся вялікі самадзейны канцэрт. Добры, аднак падчас яго — ці паверыце? — не прагучала ніводнай беларускай песні. І мне — чым больш сядзеў і слухаў — тым больш здавалася, што я не дома, не ў Беларусі, а скажам, у Навазыбкаўскім раёне Бранскай вобласці...

Што ж трэба зрабіць, каб наша мова жыла? На мой погляд, пераважная большасць эфіру і плошчы газет, назвы якіх даюцца па-беларуску, павінны адводзіцца матэрыялам менавіта на роднай мове. На ёй жа павінны быць шыльды на ўсіх дзяржаўных установах, таблічкі на кабінетах... Пакуль жа нават падчас пасяджэння беларускага парламента інфармацыя даецца па-руску: «Голосовало... Против... Воздержалось...» А чаму не «супраць», не «ўстрымалася»?

...Прыкладаў, якія выклікаюць вось такое, па-руску кажучы, «недоумение», можна прыводзіць шмат. Спадзяюся, што «Звязда» надрукуе хоць тыя, што я напісаў, і гэта будзе пачутым.

**А. Е. Пятруннікаў,** *г. Баранавічы.*

Век жыві...

## Хто зашмат жадае, нічога не мае

**Як вядома, капейка рубель беражэ, і шмат хто яго, эканомячы, хоча нешта даражэй прадаць і танней купіць. Я таксама не выключэнне, хоць пры гэтым усё часцей і часцей успамінаю двух сваіх землякоў.**

Адзін з іх, дзядзька Уладзя, досыць доўга тады хадзіў па базары — прыглядаўся, прыцэньваўся, — хацеў кабанчыка прыдбаць. Людзі іх, вядома ж, прадавалі — розных, шмат, але дзядзька шукаў найтаннейшага сярод найлепшых.

І што вы думаеце: знайшоў-такі!

— Есць — ну як не ў сябе! — стаў даводзіць яму прадавец («Значыць, хутка будзе вагу набіраць», — цешыўся будучы пакупнік). — І грошай шмат не вазьму, бо ён апошні застаўся. Бяры.

Мужчыны ўдарылі па руках і разышліся.

Дзядзька Уладзя, шчаслівы пакупкай, прывёз парсючка дадому, стаў карміць ды радавацца, што кабанчык яго і праўда есць — аж вушы ляпаюць... Адзінае, што пры гэтым амаль не расце. Хіба галава, а ўсё астатняе...

Дзядзька доўга вачам не верыў — прыглядаўся, спадзяваўся, але ўсё было марна: не дачакаўся ён істотных прывагаў.

...Што цікава, праз нейкі час, калі ўжо і мяса не засталося, на тым жа базары прадаўца сустрэў. Сказаў:

— Ну ты, брат, і ўдружыў мне з кабанчыкам... У яго ж толькі галава расла, ведаеш?

— Ведаю, — уздыхнуў прадавец. — Я сам яго з год карміў.

Праўду кажуць: хто зашмат жадае, нічога не мае. Ну ці амаль...

**С. Кузняцоў,** *Быхаўскі раён.*

Уражанні

## Жарты нічога не варты?..

**Што ёсць, тое ёсць: на сёння ці не сто прычын, каб сапсаваць настрой, і вобмаль, каб яго палепшыць.**

**Добрая навіна: у сталічным выдавецтве «Чатыры чвэрці» выйшла кніга ўсмешак мастака Анатоля Гармазы.**




Трэба сказаць, што ўсміхацца ён пачаў досыць даўно — у далёкім 1955-м, калі нарадзіўся, а вось краіну смяшыць — гадоў праз 20, змясціўшы сваю першую карыкатуру ў часопісе «Вожык», потым — працуючы там галоўным мастаком і паралельна друкуючы свае творы ў «ЛіМе», «Звяздзе», «Сельской газете», «Работніцы і сялянцы»... А далей — болей: у расійскім «Крокодиле», украінскім «Перцы», польскіх «Шпільках», французскім «Фігаро»...




Апроч таго, карыкатуры (яны ж свайго роду анекдоты — трапныя, зразумелыя без слоў) ды сяброўскія шаржы Анатоля Гармазы ўдзельнічалі ў многіх выставах і бліжняга, і дальняга замежжа.

Цяпер найлепшае, сабранае разам у раздзелах «Будзьце здаровы», «Я на дачу еду, плачу», «Жыццё пасля ЗАГСа», «Шкодныя звычкі» і г. д., выйшла асобнай кніжкай. Быў намер, як прызнаецца аўтар, нават на серыю іх замахнуцца: выдаць творы сяброў па цэху (балазе, мастакоў-гумарыстаў у краіне шмат — і было, і ёсць), аднак... Гэта, як той казаў, дарагое задавальненне... Дзе і першае, і другое — факт. Як і тое, што жарты нічога не варты, але ж часам праўдзяцца.

**В. Емельянчык,** *г. Мінск.*

Людзі і лёсы

## ...На яе былі ўсе надзеі

**Чалавек вясковы, а тым больш пажылы, прывык прачынацца рана. Ёсць неадкладная работа, значыць, трэба спяшацца, а не, — можна пагрузіцца ў лянівую дрымоту: у тое ж горкае пасляваеннае дзяцінства і юнацтва, у трохі шчаслівейшую маладосць.**

Равесніцы Перамогі Франі Васілеўне Лытні ёсць, вядома, што ўспомніць: родную вёску Старожыцы на беразе возера Сялява з ліпавай алеяй; з чаромхай, скверык з валейбольным і футбольным полем, лугі з рамонкамі... Людзі бераглі гэту прыгажосць, у святы збіраліся разам, гаманілі, жартавалі, спявалі харошыя песні, хоць тады, здавалася б, зусім не да гэтага. Вяскоўцы працавалі за так званыя палачкі (пустыя працадні), а падаткі мусілі плаціць грашыма і не толькі за скаціну, але і за кожную яблыню ці сліву...

Франя ў сваёй сям'і была старэйшай, значыць, змалку адказнай за траіх малодшых дзяцей, а таксама за чараду гусянят, якіх кіраўніцтва калгаса раздавала вяскоўцам на вырошчванне. І не дай бог было дапусціць, каб хоць адно малое да раптам прапала...

Ад нелюбімай справы па доглядзе гусянят Франю ратавала хіба вучоба ды заняткі спортам. І адно, і другое давалася дзяўчынцы лёгка. Пасля школы нават падумвала, ці не паступіць у інстытут фізкультуры? Але ж медыцына вабіла больш, і таму, на выдатна скончыўшы фельчарскі факультэт Баранавіцкага медвучылішча, Франя прыехала на сваё першае рабочае месца — на Бярэзіншчыну, у Брадзецкі ФАП.

Любімая справа, прыгожыя мясціны, кавалеры... Што яшчэ, здавалася б, трэба маладой абаяльнай дзяўчыне, якая ўжо тады была прыкладам для іншых — у адносінах да працы і людзей, у паводзінах. Яна не зносіла бястактнасці і хамства, як медык, змагалася з курэннем, п'янствам, мацюкамі.

Можа, яшчэ і таму Франю хутка запрасілі на работу ў цэнтральную раённую бальніцу — урачом на станцыю хуткай дапамогі.

Праца на такім адказным участку была для дзяўчыны сапраўдным выпрабаваннем — у тым ліку на смеласць і мужнасць. Памятае, як сама сабе і не раз давала загад: «Без эмоцый. На мяне тут усе надзеі. Чалавеку трэба дапамагчы». У многіх выпадках, асабліва на пажарах ды пры дарожных аварыях Франі Васілеўне было па-сапраўднаму страшна, але адступаць яна не мела права: хто на што вучыўся.

І ўсё ж у яе жыцці быў перыяд, калі яна вырашыла памяняць прафесію: паступіла ў Горацкую акадэмію, атрымала дыплом агранома, паспрабавала ездзіць па палетках, сеяць-збіраць ураджаі, пісаць і — што там хаваць — прыпісваць цэнтнеры...

А таму досыць хутка жанчына зразумела, што вось гэта — не яе. Значыць, трэба вяртацца назад на «хуткую дапамогу».

Бянтэжыла, праўда, што жыла на той час у вёсцы, а ездзіць на работу трэба ў горад... Але і тут адшукалася выйсце: Франя Васілеўна лёгка «асвоіла» скутар (тады гэта рэдкасць была) і так ліха стала «рассякаць» на ім па дарогах і вуліцах, што многія кіроўцы-мужчыны азіраліся ды дзівіліся: якая малайчына, маўляў!..

Цяпер гэта ўсё ў мінулым. Як і шчаслівыя гады жыцця за мужам, добрым, клапатлівым Іванам Іванавічам Санько, якога бясконца любіла і ў пары з якім гадавала дзяцей. На жаль, ён рана памёр, і таму Франі Васілеўне адной даводзіцца прымаць гасцей, цешыцца сваімі нашчадкамі, пладамі дрэў свайго саду, вырошчваць кветкі і агародніну. На ўсё іншае проста не хапае сіл. І суцяшае тут толькі адно: тое, што патрачаны яны не марна, што для многіх, з кім звозіў лёс, само жыццё яе стала прыкладам.

**Ніна Бурко,** *Бярэзінскі раён.*

Перажытае — незабытае

# АСАБЛІВАСЦІ СЯМЕЙНАЙ РЫБАЛКІ

**Рыбалка — гэта ў мяне ў крыві. Заядлым рыбаком быў наш бацечка Рыгор Паўлавіч. Зімой ён плёў нераты з лазовых дубцоў і сеткі з канапляных нітак... Каноплі тады раслі ў садах, ратуючы іх ад шкоднікаў, а зярняткі гаспадыні таўклі ў драўляных ступках і потым падавалі з печаной бульбай. Смаката — простая невыказная!**

Шчупакі і ліні ў нас таксама былі нязводныя. Тата працаваў у райцэнтры за 12 вёрст, але ўсё роўна двойчы-тройчы на тыдзень (у суботу з нядзеляй гэта святое) літаральна бег да сваіх азёраў: правяраў нераты, даставаў рыбу і нават... ляжыўся.

Так-так, у вайну тата — стралок-радыст авіяцыйнай эскадрыллі — быў паранены, двойчы скакаў з палаючага самалёта. З часам гэта «адгукнулася», і тату ў яго 30 гадоў давялося хадзіць з кійком.

Дык вось неяк у сакавіку, калі з-за недахопу кіслароду рыба выскоквае з палонак, тата паслізнуўся і з галавой апынуўся ў вадзе. Хутка выбраўся, але ж дом за чатыры вярсты... Ён пабег.

Потым цяжка хварэў на запаленне лёгкіх — мама ледзь выхадзіла яго... А ўстаў на ногі і пайшоў — без кійка. Можа, стрэс паспрыяў, можа, лекавая сіла крыніц?

...«Прафесійна», можна сказаць, займаўся рыбалкай і мой дзядуля Паўлюк — чалавек разумны, пакладзісты. Да таго ж спявак, гумарыст, але і ў яго найпершым захапленнем была рыбалка. Дзед адным з першых запісаўся ў калгас: у агульнае карыстанне здаў свой сціплы рыштунак, і папрасіў для сабе «пасаду» конюха. Зноў жа, дзеля рыбалкі: зранку «выдаваў» тых «вараных» для гаспадарчых работ, а па начах пасвіў... Бліжэй да возера... Ваўкоў было шмат дык ён для аховы раскладваў вогнішчы, а сам... ішоў правяраць свае нераты ды сеткі. Пра яго нават жарт гуляў:

*Павел Зольнікаў на рыбу*
*Прамяняў усю сядзібу.*
*Меней сеяў, меней жаў,*
*Болей рыбай прамышляў.*

У час апошняй вайны гэтая рыба выратавала жыццё. У 1943-м фашысты, як тыя каршуны, праз дзень наляталі на вёску, патрабавалі «млеко, яйкі, шпік». А дзе ж іх браць? Зімой каровы не доіцца, куры не нясуцца, кабанчык сам цэлы дзень есці просіць. Ды ворагу што — дзе хочаш бяры, але давай, а не — дык... Часам стралялі.

Дзед неяк толькі высек з ночваў вялікі кавалак замарожанага шчупака, як у хату ўваліўся фрыц, вылупіў вочы на рыбу, а потым падняў угору вялікі палец і радасна заверашчаў: «Фіш, фіш! Добра!»

Дзеду таксама нядрэнна было, бо забраўшы палову рыбы, немец не зачапіў нікога з сям'і.

Так і жылі амаль да вызвалення вёскі, якую ка́ты ўсё ж спалілі, а дзеда штурхнулі ў полымя. Ён, дзякуй Богу, выжыў.

Вёска наша звалася і завецца Рудняю. Амаль усе мужчыны ў нас, хто як умеў, вудзілі. А вось гарэлку не гнаў ніхто.

Я таксама засвоіла ўсю рыбацкую навуку: і сеткі пляла, і човен кітавала, і з таптухай хадзіла, і «таранку» сушыла»... Мы, студэнты, любілі грызці яе. Пра піва і думак тады не было...

**Наталля Сівак,** *Чэрвеньскі раён.*

**Пошту чытала Валянціна ДОЎНАР.**



# НЕЗВЫЧАЙНЫ ПАСАЖЫР І НАТХНЯЛЬНІК



*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*



Персону Івана Будзіча нашаму чытачу асабліва і прадстаўляць не трэба — неаднойчы яго партрэт упрыгожваў «Звязду». І ўсё ж мы зноў звяртаемся да гэтай асобы, бо, насамрэч, як паказаць у адным здымку дзівосны свет самабытнага і апантанага графіка і разьбяра? Таму сённяшні выпуск рубрыкі «фота на 13-й» прысвечаны менавіта яму — творцу з Пазер'я і, вядома, яго творчаму брэнду — драўлянаму мядзведзю. А нагодай сустрэчы з Іванам Мікалаевічам стала яго персанальная выстаўка ў Лепельскім краязнаўчым музеі, на якой майстар прадставіў шырокую і багатую палітру сваіх здольнасцяў, хоць і выставіў невялікую частку твораў, выкананых у розных тэхніках, жанрах і кірунках — графіцы, акварэлі, барэльефна-аб'ёмнай разьбе і драўлянай скульптуры. У маленькай майстэрні мастака не ўбачыш тое, што можна разглядзець, палюбавацца і ацаніць на адлегласці, у строгім афармленні, і, галоўнае, у адпаведным настраёвым асяроддзі. У такой атмасферы добра бачна, якая плённая, працавітая натура ў мастака, якая ў яго паэтычная і акрыленая душа, колькі ў яго задум і ўвасабленняў, фантазіі і творчай энергіі. Здаецца, у творцы крыніца натхнення і з узростам невычэрпная.

Івану Мікалаевічу толькі шэсцьдзясят. Дзве трэці з пражытага аддадзена мастацтву. Пасля заканчэння Віцебскага мастацка-графічнага педінстытута Іван афармляў кнігі ў дзяржаўным выдавецтве, пазней стаў настаўнікам лепельскай дзіцячай мастацкай школы і да сёння вучыць дзяцей маляваць і выразаць з дрэва, бачыць і ствараць прыгожае. І, па-ранейшаму захапляецца выразаннем драўляных фігур касалапых — усмешлівых і дабрадушных мядзведзяў. Гэты чырванакніжнік — сапраўдны канёк разьбяра і яго візітоўка. Колькі касалапых Будзіча разбрылося і «гуляе» па свеце! Ёсць яны і ў Англіі, Германіі, Даніі, Малдове, Расіі, Эстоніі, не кажучы пра Беларусь. Калі сабраць усю калекцыю «мішак», якіх выразаў лепельскі разьбяр за ўсё творчае жыццё, атрымаецца незвычайная «мядзведжая акадэмія».

**Анатоль КЛЯШЧУК,**
**фота аўтара.**

*На здымках — эпізод з персанальнай выстаўкі і моманты леташніх здымкаў у прыватнай майстэрні мастака.*

***Глядзіце больш фота на сайце zviazda.by.***





Цікавае побач

# ІКОНА З «САКРЭТАМ»

## Як у старажытным храме ахоўваецца ікона з золатам, што прыносяць вернікі



**Многія прыязджаюць у Сынкавіцкую царкву, каб убачыць старажытны храм, якому больш за 600 гадоў. Помнік гісторыі і архітэктуры, які знаходзіцца ў Зэльвенскім раёне, што на Гродзеншчыне, уключаны ў мноства турыстычных маршрутаў. Аднак мала хто ведае, што сюды едуць і лячыцца. Пра гэта красамоўна сведчыць ікона, упрыгожаная залатымі вырабамі. Штогод 31 жніўня ў яе гонар праходзіць царкоўнае свята.**



### ЦАРЫЦА ІКОН

Прызнацца, такой колькасці каштоўных вырабаў у храмах бачыць не даводзілася. Іх, як правіла, прывозяць сюды тыя, хто з дапамогай малітвы перамог хваробы. Як выглядае, такіх нямала — магчыма, не адна сотня. Большасць вырабаў, якія знаходзяцца пад шклом іконы, гэта залатыя ланцужкі.

— Кожны месяц з'яўляецца да дзесяці новых вырабаў, і гэта толькі з золата. Сярэбраныя захоўваюцца ў алтары, — расказвае матушка Ксенія Ананка. — Гэта значыць, што нехта прыязджае і дзякуе за пачутую малітву, прыносіць ахвяру.

Ікона, якая густа завешана золатам, — гэта абраз Божай маці Усецарыцы. Менавіта ён лічыцца ў храме цудадзейным. Гэта сучасны спіс з іконы XVII стагоддзя, якая захоўваецца ў манастыры на святой гары Афон у Грэцыі. Гісторыю абраза данёс з XX стагоддзя афонскі старац. Ён расказваў, які станоўчы ўплыў аказвае ікона на хворых з рознымі пухлінамі. З гэтага абраза сталі рабіць спісы для іншых храмаў.

— Першы выпадак вылечэння адбыўся дзякуючы нашай іконе адбыўся крыху больш за 10 гадоў таму, — працягвае расказ матушка Ксенія. — Маладой дзяўчыне з Мінска быў пастаўлены дыягназ, а па сутнасці прысуд, трэба было рабіць найскладанейшую аперацыю. Яна даведалася пра наш храм і прыехала сюды. Пасля малітвы, ідучы на аперацыю, яна здала аналізы, і яны былі добрыя. Гэтая дзяўчына прыехала да нас з букетам руж, зняла з сябе каштоўнае ўпрыгажэнне і паклала перад іконай.

Па словах Ксеніі, такіх вырабаў апошнім часам прыбавілася і ад бяздзетных сем'яў. У адных не было дзяцей чатыры гады, у другіх — васямнаццаць. Быў выпадак, калі пасля наведвання храма жанчына нарадзіла ў 51 год. І такія цуды адбываюцца і да гэтага часу. Дарэчы, у храме два разы на месяц адбываецца спецыяльны малебен аб хворых.

Вядома, не магла не цікавіць ахоўнасць такой колькасці золата і срэбра. Сапраўды, кажа Ксенія Ананка, у царкве былі спробы выкрасці каштоўнасці. Праўда, давесці гэту чорную справу да канца зладзеям не ўдалося, а пасля такіх выпадкаў на іконе ўстанавілі сучасную сігналізацыю і відэаназіранне, таму цяпер ніхто не спрабуе зрабіць замах на «царыцыну» ахвяру.

### КАМУ ІКОНА, КАМУ ПІСЬМЁНЫ...

Акрамя іконы, у храме ёсць і іншыя цуды. Старажытная царква ахутана таямніцамі. Некалькі гадоў таму на сценах знойдзены графіці на грэчаскай мове. І хоць пабудова датуецца XV стагоддзем, надпісы сведчаць пра тое, што храм значна старэйшы. Магчыма, гэта XII стагоддзе, на што паказваюць і славутыя збаны-галаснікі, умантаваныя ў сцяну для асобай акустыкі. Такія галаснікі ёсць у самым старажытным храме XII стагоддзя — Каложскай царкве ў Гродне.

Што датычыцца фрэсак, дык іх выяўлена чатыры, кажа матушка Ксенія. Невялікія квадраты з пісьмёнамі знаходзяцца на двух сценах храма. Наўрад ці іх будзе больш, бо ўся фарба ўжо знята. Частка фрэсак расшыфравана, астатнія яшчэ ў рабоце. Цікава, што такія пісьмёны не знойдзены ні ў адным іншым храме. Відавочна, што гэта замак-крэпасць, аб чым нагадвае і галоўны фасад з вежай і байніцамі. Тут прыгадалі і той факт, што ў замку, ужо значна разваленым, у XIV стагоддзі хаваўся вялікі князь Вітаўт. Ён і перабудаваў замак у храм. Асвяцілі яго ў 1407 годзе ў гонар свята архангела Міхаіла.

### УСІМ МІРАМ

Дзіўна, але храм за 600 гадоў амаль не пацярпеў: як яго тады пабудавалі, так ён зараз і стаіць. Праўда, яго прызначэнне не заўсёды было царкоўным.

— Храм быў вельмі прыгожы, тут было мноства ікон, — расказвае сураз моўнік. — Аднак у савецкі час тут размяшчалася збожжасховішча. Усё, што было каштоўнага, вывезена. Сцены былі пабелены ці замаляваны алейнай фарбай — толькі нядаўна яе знялі.

